КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 27 (203) ◂ 16 ліпеня ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



## МІРАСЛАЎ КОБАСА

Стар. 4

## ПРЫНАДА ДЛЯ «ЗЯЛЁНАГА» ТУРЫСТА

Паўночная Беларусь — край дзікі і малавядомы нават беларусам. А на лясной сцежцы тут можна сустрэць і мядзведзя, і рысь

Стар. 6

## МУНДЫЯЛЬ: АД А ДА Я

Журналісты польскай газеты «Sport» склалі ў алфавітным парадку спіс рэчаў і падзей, якімі найбольш запоўніўся еўрапейцам Чэмпіянат свету па футболе ў Паўднёвай Афрыцы

Стар. 11

## ГІСТАРЫЧНАЕ РЭХА ГРУНВАЛЬДА

Стар. 15

ISSN 2218-2144
9 772218 214401 10027

ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!

## ШТО ЗАМІНАЕ ПАЛІТЫЧНЫМ ТАНЦОРАМ

Нарыс Сяргея Нікалюка з цыклу «Азбука паліталогіі»

▸ САЦЫЯЛОГІЯ

# ГУЛЬНЯ Ў АДНЫ ВАРОТЫ

Вольга ХВОІН

**За некалькі месяцаў да чарговых прэзідэнцкіх выбараў НІСЭПД правёў сацыялагічнае даследаванне, вынікі якога паказалі, што рэйтынгі амаль усіх палітыкаў, якія заявілі пра свае лідэрскія амбіцыі, ніжэй плінтусу. Часу да дня выбараў засталося не так многа, а дзеянняў кандыдатаў у кандыдаты, якія б прываблівалі на свой бок выбарцаў, не бачна.**




### Статыстычная хібнасць

Сацыёлагі канстатуюць, што рэйтынг Аляксандра Лукашэнкі па-ранейшаму стабільны, апазіцыйныя кандыдаты нават ва ўмовах блізкай электаральнай кампаніі, калі палітычная актыўнасць насельніцтва ўзрастае, застаюцца на ўзбочыне.

Адказваючы на пытанне, за каго б яны аддалі свае галасы, рэспандэнты выказалі падтрымку дзейснаму кіраўніку дзяржавы Аляксандру Лукашэнку — 48,3%, Аляксандру Мілінкевічу — 9,9%, Аляксандру Казуліну — 7,5%, рэйтынг астатніх кандыдатаў застаўся ў межах статыстычнай хібнасці: Алесь Міхалевіч (2,4%), Віталь Рымашэўскі і Яраслаў Раманчук (1%), Мікалай Статкевіч,— 0,8%, Андрэй Саннікаў — 0,5%. У падтрымку Уладзіміра Някляева, лідэра грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду!», выказаліся 1,6% апытаных. 17% рэспандэнтаў не змаглі адказаць на пастаўленае пытанне.

Але Віталь Рымашэўскі на свае палітычныя перспектывы глядзіць аптымістычна. «Хіба ў прэзідэнцкай кампаніі мусяць удзельнічаць тыя, хто мае рэйтынг, як у Лукашэнкі? — задае Рымашэўскі сустрэчнае пытанне на просьбу патлумачыць, як з такім нізкім стартам ён пойдзе да перамогі. — Людзі чакаюць новых асобаў. Зрэшты, калі скласці негатыўны і пазітыўны рэйтынг публічных асобаў, то думаю, што найбольшы пазітыўны рэйтынг будзе якраз у малавядомых людзей. У гісторыі ёсць безліч прыкладаў таго, як палітыкі за кароткі прамежак часу набывалі папулярнасць, вядомасць».

Рымашэўскі нагадаў, што для перамогі патрэбны 51 працэнт галасоў выбарцаў, але на першым этапе, паводле яго слоў, трэба набраць 20–25 працэнтаў. «Наша кампанія не будзе будавацца выключна на маёй персоне, мы будзем працаваць праз узмацненне пазіцый рэгіянальных лідэраў, структур партыі», — дзеліцца планамі на бліжэйшую электаральную кампанію Рымашэўскі.

Эксперт НІСЭПД, доктар Аляксандр Сасноў гаворыць, што, тэарэтычна, названыя палітыкі маглі б падняць свой рэйтынг да прэзідэнцкіх выбараў, але з умовай, што яны атрымаюць доступ да радыё, тэлебачання і друкаваных СМІ. «Толькі хто гэта дазволіць? Ёсць яшчэ варыянт, што ўлада будзе «душыць» сваіх апанентаў, тады гэта таксама згуляе на карысць рэйтынгу прэтэндэнтаў на прэзідэнцкі фатэль. Увогуле, калі б нехта займеў рэйтынг, роўны рэйтынгу Лукашэнкі, думаю, улады пазбавіліся б ад такога канкурэнта», — рэзюмуе Сасноў.

Што тычыцца папулярнасці Лукашэнкі, то эксперт тлумачыць гэта тым, што ён адзіны публічны палітык у беларускай прасторы. Апроч таго, на карысць дзейснаму кіраўніку Беларусі гуляе і тое, што ёсць інфармацыйныя нагоды, як, напрыклад, дыскусіі вакол Мытнага саюза, калі Лукашэнка намагаўся навязаць сваю пазіцыю Расіі. І, паводле беларускіх СМІ, выйшаў нават пераможцам. Аляксандр Сасноў нагадвае, што застаецца нявыкарыстаным рэзерв адміністрацыйнага рэсурсу — улады пакуль не рабілі выплат, паказальных зняццяў з высокіх пасадаў.

### Каму патрэбна праўда

Эксперты НІСЭПД сцвярджаюць, што, нягледзячы на актыўную працу з людзьмі, паездкі па рэгіёнах і красавіцкіяператрусы ў офісах грамадскіх арганізацый і кватэрах актывістаў грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду!», рэйтынг яе застаецца невысокім. Хаця «Гавары праўду!» ужо амаль паўгода дзейнічае на прасторах Беларусі, і ў яе падтрымку выказаўся шэраг вядомых асобаў, як, напрыклад, Генадзь Бураўкін, Рыгор Барадулін, Радзім Гарэцкі, раскрутка кампаніі не надта маштабная.

У чэрвені на пытанне: «Ці ведаеце вы што-небудзь аб грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду!»?» сцвярджальна адказалі толькі 12,5% рэспандэнтаў. Калі ўлічыць, што падзеі, звязаныя з вобшукамі, на працягу пэўнага часу былі галоўнай навіной на старонках незалежных газет і ў беларускім сегменце інтэрнэту, дык такі ўзровень пазнавальнасці варта прызнаць невысокім, — гавораць даследчыкі. І дадаюць, што ў чэрвені штодня карысталіся інтэрнэтам 13,1% беларусаў, некалькі разоў на тыдзень — 16,1% і некалькі разоў на месяц — 9,8%. Справа не ў адсутнасці інфармацыі, а ў адсутнасці цікавасці да яе.

Лідэр кампаніі «Гавары праўду!» Уладзімір Някляеў выказваўся наконт свайго магчымага вылучэння ў якасці кандыдата на пасаду прэзідэнта, аднак сацыёлагі папярэджваюць, што ў беларускіх рэаліях перамога і рэйтынг слаба карэлююцца.

Працяг на стар. 5 ▸

ЗВАРОТ

# АЎТУХОВІЧ ЗАКЛІКАЕ ЯДНАЦЦА

**Днямі праваабаронцы атрымалі ліст палітзняволенага Мікалая Аўтуховіча. Як паведаміў юрыст і праваабаронца Алег Волчак, хутка Аўтуховіча адправяць у Івацэвіцкую калонію. Але сёння Мікалая Аўтуховіча хвалюе не яго ўласная справа, а тое, што адбываецца ў краіне.**

«Наш народ хоча пераменаў, — лічыць Мікалай Аўтуховіч, — народ гатовы выбраць іншы, цывілізаваны шлях для развіцця Беларусі. Але для таго, каб людзі пайшлі за намі, патрэбна рэальная і разумная праграма пераменаў, якая была б зразумелая любому чалавеку. Трэба знайсці самы пранікліві пасыл да людзей, які мог бы іх прымусіць не баяцца і перамагаць. Калі апазіцыя гэта зможа, то пад сцягам пераменаў можна зрабіць рэальнае прасоўванне да дэмакратыі ўжо ў найбліжэйшым годзе. Я зараз у турме, але тут побач са мной знаходзяцца прадстаўнікі ўсіх слаёў насельніцтва, мы на самым дне гэтага ўбогага жыцця, і прасвет у маім жыцці і ў жыцці гэтых людзей залежыць толькі ад вас, мае дарагія суграмадзяне».

«Я бачу, што на падыходзе час іншых людзей, але без нашай сумеснай салідарнасці гэты час можа так і не наступіць, — гаворыцца ў лісце,— І таму звяртаюся да ўсіх палітыкаў — яднайцеся, стварайце агульную каманду са стойкіх, ідэйных і мужных людзей, здольных стаць элітай новай улады. Толькі ў гэтым гарантыя пераменаў».

Таксама Мікалай Аўтуховіч падзякаваў усім, хто ўвесь час яго падтрымліваў: журналістам, праваабаронцам, простым людзям.

Нагадаем, Мікалай Аўтуховіч асуджаны да пяці гадоў пазбаўлення волі нібыта за незаконнае захоўванне патронаў. Вядомага актывіста спачатку спрабавалі абвінаваціць у тэрарызме, падрыхтоўцы замаху на кіраўніка Гродзенскай вобласці і многае іншае. Справа рассыпалася на вачах.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ЗНІКАЮЦЬ НАКЛАДЫ НЕЗАЛЕЖНЫХ ГАЗЕТ

Генадзь КЕСНЕР

**У медыяпрасторы Беларусі працягваюцца дыскусіі вакол таямнічых знікненняў частак накладаў дзвюх незалежных грамадска-палітычных газет — «Наша ніва» і «Вольны горад» (Крычаў), дзе была змешчана інфармацыя пра дакументальны фільм «Хросны бацька», які прадэманстраваў расійскі тэлеканал НТВ.**

Якасці гэтай стужкі, галоўным героем якой з'яўляецца дзейны прэзідэнт Беларусі і якую не паказалі ў нашай краіне, пакінем у баку. Але што азначае гэты выпадак са знікненнем часткі тыражу недзяржаўных выданняў?

Галоўны рэдактар «Нашай Нівы» Андрэй Дынько ацэньвае гэту з'яву як адназначна праяву цэнзуры. «З'яўленне артыкула ў газеце выклікала чыёсьці раздражненне, таму частку накладу не прапусцілі. Цікава, што загаловак артыкула быў «Хросны бацька капітуліраваў». Як вынікае, у Беларусі нельга пісаць, што Лукашэнка капітуліраваў, ён павінен толькі перамагаць, таму мы і патрапілі пад гэтую цэнзуру», — адзначыў Андрэй Дынько.

«Мы бачым не толькі канфіскацыю часткі накладу, мы ўвогуле бачым яго знікненне, — звяртае ўвагу намеснік старшыні ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» юрыст Андрэй Бастунец. — З такой практыкай у Беларусі мы ўжо сутыкаліся неаднаразова, і я думаю, што з набліжэннем прэзідэнцкіх выбараў такія моманты будуць мець месца часцей. Наўрад ці будуць з'яўляцца белыя плямы ў газетах, як гэта было раней. Улады шмат чаму навучыліся, але вось такія незразумелыя знікненні накладаў ці парады супрацоўнікаў друкарняў зняць той ці іншы матэрыял атрымаюць даволі шырокі распаўсюд».

Андрэй Дынько мяркуе, што такім чынам улады спрабуюць прымусіць незалежныя грамадска-палітычныя выданні працаваць у акрэсленых рамках. «Для мяне гэта своеасаблівая праверка на вашывасць — ці будзем мы прымяняць самацэнзуру пасля гэтага выпадку ці не. Мы самацэнзуру прымяняць не будзем», — заявіў галоўны рэдактар «Нашай Нівы».

Трэба дадаць, што знікненне часткі накладу з'яўляецца і нанясеннем матэрыяльнага ўрону названым газетам. А Андрэй Бастунец называе адбытае парушэннем дзейнага заканадаўства, якое мае за мэту абмежаваць свабоду СМІ, і нагадвае, што ў Адміністратыўным кодэксе за гэта прадугледжаны штрафы. Але ці зацікавіць гэтая сентэнцыя беларускія суды, можна толькі здагадвацца.

ВАЙНА

# У «БАБУЛІНАЙ КРЫНКІ» ЗНОЎ ПРАБЛЕМЫ

Багдан ІВАНОЎ

**«Рассельгаснагляд» у чарговы раз з 25 чэрвеня ўвёў абмежаванні на пастаўку ў Расію малака і малочнай прадукцыі з чатырох беларускіх прадпрыемстваў. Забарона была ўведзена ў сувязі з «неаднаразовым выяўленнем антыбіётыкаў тэтрацыклінавай групы ў прадукцыі, якая пастуіла ў Расію».**

У спіс прадпрыемстваў, прадукцыя якіх была забаронена для ўвозу ў Расію, трапілі «Барысаўскі малочны камбінат», «Асіповіцкі малочны камбінат», «Бярозаўскі сыраробны камбінат» і лідэр малочнай вытворчасці Магілёўскай вобласці — ААТ «Бабуліна крынка».

Ці былі аб'ектыўныя падставы ў расійскіх кантралёраў для ўводу забароны на ўвоз прадукцыі, у прыватнасці, «Бабулінай крынкі», — вялікае пытанне. Літаральна напярэдадні ўводу забароны на пастаўку прадукцыі ў Расію «Бабуліна крынка» атрымала сертыфікат якасці ад грамадскай установы LST Sert, акрэдытаванай пры Нацыянальным бюро Літоўскай рэспублікі, якая ўпаўнаважана Еўрасаюзам праводзіць аўдыт і выдаваць сертыфікаты адпаведнасці еўрапейскім патрабаванням якасці і бяспекі.

Аўдытары LST Sert прызналі, што жорсткім еўрапейскім патрабаванням якасці адпавядае ўвесь спектр прадукцыі кампаніі, заяўлены для сертыфікацыі: сухія малочныя прадукты, натуральнамалочная прадукцыя, масла сметанковае, марожанае, сыры паўцвёрдыя і цвёрдыя. У Рэспубліцы Беларусь ААТ «Бабуліна крынка» першай здолела атрымаць еўрапейскі сертыфікат на такі вялікі спіс прадукцыі.

Літаральна перад увядзеннем забароны на пастаўку малака ў Расію віцэ-прэм'ер Беларускага ўраду Андрэй Кабякоў падчас Пецярбургскага міжнароднага эканамічнага форума заявіў, што Беларусь не чакае новых супярэчнасцяў з Расіяй на малочным рынку. У прыватнасці, ён сказаў, што «перыяд узнікнення праблемаў» ужо прайшоў і дасягнутыя за апошні год дамоўленасці «даюць упэўненасць, што падобнага супрацьстаяння інтарэсаў ужо не будзе». Нічога не скажаш, «дакладны» прагноз.

Тым часам супрацоўнікі бяльніцкага філіяла ААТ «Бабуліна крынка» зараз знаходзяцца ў стане няўпэўненасці ў заўтрашнім дне, бо большая частка прадукцыі прадпрыемства раней ішла ў Расію. Сярод работнікаў прадпрыемства ходзяць чуткі, што цэх па вытворчасці сыроў можа прыпыніць сваю працу на некалькі месяцаў. Людзі добра памятаюць, як у мінулым годзе, падчас папярэдняй «малочнай вайны» з Расіяй, філіял некалькі месяцаў працаваў толькі ў якасці малакапрыёмнага пункта. Ужо зараз многія работнікі прадпрыемства адпраўлены ў адпачынак. Тым часам «старацелі», якія здабываюць сабе на пражыццё працай на сметніку каля вёскі Асавец, кажуць, што апошнім часам на звалку сталі вывозіць шмат сыра.

КРУГЛЫ СТОЛ

# ПРАСПЕКТ ВІТАЎТА ЗАМЕСТ ДЗЯРЖЫНСКАГА

**На круглым стале, прысвечаным ролі Грунвальдскай перамогі ў гісторыі Беларусі і іншых еўрапейскіх краін, прадстаўнікі аргкамітэту па святкаванню Грунвальда агучылі свае ініцыятывы.**

У мерапрыемстве прынялі актыўны ўдзел гісторыкі Сяргей Тарасаў, Анатоль Тарас, мастак Мікола Купава і святар БАПЦ айцец Леанід Акаловіч.

Удзельнікі круглага стала наракалі на тое, што, з прычыны абыякавасці беларускай дзяржавы да нашай гісторыі, славу беларускіх продкаў часта прыпісваюць сабе іншыя народы. Пакуль улады часам пагаджаюцца толькі на тое, каб імёны сапраўдных беларускіх гістарычных постацей надаваць вулачкам на ўскраінах.

Паводле Анатоля Тараса, у дыскусіях з гісторыкамі той жа Літвы трэба абапірацца на нямецкія крыніцы як больш дакладныя. На думку гісторыка, няма сэнсу спрачацца за гістарычную праўду з іншымі краінамі. Трэба прапагандаваць уласную, няхай нават трохі міфалагізаваную гісторыю ў Беларусі, выхоўваць на ёй сваё пакаленне. І праз 10 гадоў самасвядомасць зменіцца.

«Калі будзе матэрыяльны дабрабыт без нацыянальнага і духоўнага стрыжня — нічога добрага ў краіне не атрымаецца. Беларусь альбо выспее ў нацыянальную дзяржаву, альбо ўвогуле знікне», — папярэдзіў гісторык.

Леанід Акаловіч пазнаёміў прысутных са зваротамі да мясцовых уладаў з просьбай перайменаваць вуліцы Мінска ў гонар Вітаўта Вялікага і караля Ягайлы, ды іншых князёў, а таксама з пісьмовай просьбай да міністра культуры надаць рэканструяваным харугвам статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. На яго думку, было б вельмі натуральна назваць імем Вітаўта цяперашні праспект Дзяржынскага, а плошчу Мясніковіча ці Юбілейную перайменаваць у плошчу Грунвальдскай перамогі. Айцец Акаловіч таксама распавёў пра ініцыятыву правесці конкурс праектаў помнікаў у гонар перамогі пад Грунвальдам у Мінску, Віцебску, Мсціславе, Віцебску, Гродна.

Паводле Анатоля Тараса, нягледзячы на складанасці, трэба пісаць і гаварыць, гаварыць і пісаць. Спачатку — на ўзроўні энтузіястаў, потым падключыцца дзяржава. Закінутая інфармацыя нікуды не знікне. Цікавасць да сваёй гісторыі насамрэч вельмі вялікая, хоць пакуль не яўная.

Намеснік старшыні аргкамітэта Мікола Купава напрыканцы зазначыў, што круглы стол з'яўляецца падрыхтоўчым этапам да навуковай канферэнцыі, прысвечанай вынікам больш дэталёвага даследавання ўдзелу беларускіх продкаў у Грунвальдскай бітве, якая запланавана на кастрычнік.

**Паводле інфармацыі аргкамітэта**

СУД

# БАНДАРЧУК НЕ ВІНАВАТЫ

**14 ліпеня суд Ленінскага раёна горада Гродна нарэшце не знайшоў складу правапарушэння ў справе грамадскага распаўсюджвальніка «Новага часу» Дзмітрыя Бандарчука.**

Два месяцы таму на гродзенскім аўтавакзале Дзмітрыя затрымалі супрацоўнікі Ленінскага РАУС і знайшлі ў яго аўтамабілі нераспакаваны пачак газеты «Новы час». Газету канфіскавалі, а хлопца адпусцілі. Але праз тыдзень на Бандарчука ўсё ж склалі пратакол аб адміністратыўным правапарушэнні. Дзмітрыя абвінавачвалі ў тым, што ён «зрабіў замах на незаконны распаўсюд друкаванага сродку масавай інфармацыі «Новы час» №12 (194) ад 14 мая 2010 года, выдадзенага з парушэннем арт. 32 закона РБ «Аб сродках масавай інфармацыі».

І вось з такім абвінавачваннем справу перадалі ў суд. Першыя два пасяджэнні правяла суддзя Наталля Козел, якая пасля допыту міліцыянераў адправіла пратакол затрымання на дапрацоўку і сышла ў адпачынак.

Працяг справы аб замаху на распаўсюд нашай газеты дастаўся суддзе Дзмітрыю Кабранцу, які нарэшце не знайшоў складу правапарушэння ў дзеяннях Бандарчука.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗАЛЕВЫ Ў СУБТРАПІЧНАЙ БЕЛАРУСІ

Генадзь КЕСНЕР

**Хочацца таго ці не, але набліжэнне ў Беларусі прэзідэнцкіх выбараў адчуваецца ўсё больш. Прычым не столькі праз гульні на ўнутрыпалітычным полі, колькі праз знешнія чыннікі. Адным з моцных пацвярджэнняў гэтаму з'яўляецца сапраўдная інфармацыйная вайна, якую развязалі расійскія мас-медыя з падачы (у чым можна не сумнявацца) Крамля.**

Залпавы ўдар па афіцыйнаму Мінску ў асобе дзейнага беларускага прэзідэнта быў нанесены як з выкарыстаннем тэлебачання, так і буйных друкаваных выданняў. Чаго вартыя толькі ўспаміны былога галоўнага рэдактара «Известий» Уладзіміра Мамантава пра свой візіт у Беларусь у складзе расійскага медыядэсанту і сустрэчу з беларускім прэзідэнтам у артыкуле «Лукоблудие».

Сама назва публікацыі патыхае непрыхаваным хамствам, а масіраванасць і разнастайнасць атакі сведчаць пра палітычную замову з боку вышэйшага расійскага кіраўніцтва.

Эксперт Аналітычнага цэнтра «Стратэгія» Валеры Карбалевіч адзначае, што гэта інфармацыйная вайна ёсць сведчаннем таго, што Расія больш не мае дастатковых і рэальных рычагоў уплыву на афіцыйны Мінск.

«Парадокс у тым (і наўрад ці гэта да канца ўсведамляюць у Маскве), што абмежаванасць уплыву Расіі на Беларусь у значнай ступені ёсць вынікам усёй папярэдняй палітыкі Расійскай Федэрацыі, — нагадвае палітолаг. — Масква стварала міжнародны дах, абараняла Мінск ад крытыкі Захаду, міжнародных арганізацый. У выніку наступіў момант, калі Расія стала заложніцай уласнай палітыкі. Аказалася, што краіна, якая па сацыякультурнай блізкасці, структуры эканомікі і знешняга гандлю, логіцы саюзніцкіх стасункаў павінна быць самай залежнай ад Расіі, у рэальнасці стала дзяржавай, на якую Масква мае найменшы ўплыў».

Эксперты прадказваюць, што фільм «Хросны бацька», паказаны па НТВ, а таксама публікацыі ў расійскіх газетах з'яўляюцца толькі «пробаю пяра», а сапраўдная «інфармацыйная вайна» пачнецца з набліжэннем саміх выбараў кіраўніка Беларусі.

Дарэчы, гэта вайна магла б быць увогуле не заўважанай тутэйшым электаратам, каб не БРСМ. Флэшмоб, які зладзілі бээрэсэмаўцы ля Камароўскага рынку ў беларускай сталіцы, па духу нічым не быў лепшым за тое, што зрабілі аўтары стужкі, супраць якой праводзілася гэтая акцыя. Справа ў тым, што ў Беларусі фільм не ўбачылі, бо з эфірнай сеткі «НТВ-Беларусь» яго папросту выкінулі. А вось акцыя БРСМ прыцягнула да гэтага антыпрэзідэнцкага «твору» такую ўвагу, што ў інтэрнэце яго паглядзелі ўжо больш за 200 тысяч чалавек, і колькасць жадаючых толькі павялічваецца.

А ў іншым геаграфічным баку — я маю на ўвазе на Захадзе — зноў пачалі заўважаць, што ў Беларусі парушаюцца правы чалавека. ЗША заклікаюць Беларусь прывесці заканадаўства ў адпаведнасць з абавязацельствамі ў рамках АБСЕ. Пра гэта казаў пастаянны прадстаўнік Злучаных Штатаў у Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе Іен Келі падчас выступу перад Пастаяннай радай арганізацыі 13 ліпеня.

Па словах Келі, ЗША занепакоены ціскам на апазіцыю і незалежныя СМІ ў Беларусі. «Пасля некаторых паляпшэнняў у канцы 2008 года мы з жалем адзначаем, што ў далейшым адбывалася толькі парушэнне нормаў АБСЕ», — падкрэсліў прадстаўнік ЗША.

Паводле яго словаў, асаблівую заклапочанасць выклікае напад 8 ліпеня на актывіста «Маладой Беларусі» Артура Фінькевіча пасля наведвання ім амбасады ЗША, папярэджанне двум журналістам «Радыё Свабода» за працу без акрэдытацыі, затрыманне 9 ліпеня ў Віцебску апазіцыйнага актывіста Сяргея Каваленкі, допыты журналіста сайта «Хартыя'97» Наталлі Радзінай. Амерыканец таксама нагадаў пра не адменены да гэтага часу артыкул 193 прым. Крымінальнага кодэкса, які прадугледжвае крымінальную адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

Падаецца, што ў з боку Захаду з прыбліжэннем прэзідэнцкіх выбараў будзе надавацца больш увагі таму, што адбываецца ў нашай краіне.

А ў краіне тым часам адбываецца самае галоўнае, з пункту гледжання ўладаў, культурнае мерапрыемства года — «Славянскі базар у Віцебску». Адкрыццё фестывалю наведаў Аляксандр Лукашэнка, які назваў «Славянскі базар у Віцебску» не толькі важнай культурнай, але палітычнай падзеяй. Адразу са «Славянскага базару» беларускі кіраўнік скіраваўся ў Крым — на юбілей свайго ўкраінскага калегі Віктара Януковіча (фармальна, праўда, мэтай паездкі з'яўляўся ўдзел у нефармальным, пардон за каламбур, саміце СНД, які працягваўся ўсяго толькі пятнаццаць хвілін і на які прыехалі ажно шэсць (!) прэзідэнтаў краін-удзельніц Садружнасці).

Але там адбылася падзея, якую мала хто заўважыў: Аляксандр Лукашэнка ў Крыме сустрэўся з прэзідэнтам Грузіі Міхаілам Саакашвілі. Як паведаміла інтэрнэт-выданне «Грузія — Online», «на сустрэчы прэзідэнты абмеркавалі двухбаковыя палітычныя і эканамічныя зносіны». «Міхаіл Саакашвілі і Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем адзначылі паглыбленне адносінаў на ўзроўні грамадскіх груп, асабліва на ўзроўні моладзі і паміж бізнес-групамі», — піша «Грузія — Online». У Грузіі лічаць, што пасля прарыву ў дыпламатычных адносінах з Захадам гэта ёсць пачатак новага этапу ў дачыненнях з краінамі СНД, якія зведваюць ціск з боку Расіі.

Як бачым, беларускі кіраўнік і тут знайшоў магчымасць пайграць на нервах у Крамля, для якога грузінскі прэзідэнт, бадай, вораг нумар адзін пасля падзеяў жніўня 2008 года.

А тым часам хатняя параза ад зборнай каманды Нідэрландаў у Кубку Дэвіса яшчэ больш пагоршыла рэйтынг беларускіх тэнісістаў. Нашы «майстры вялікай ракеткі» апусціліся з 42 на 46 месца, а колькасць набраных імі пунктаў зменшылася з 560 да 480. Застаецца спадзявацца на поспехі на кортах нашых дзяўчат, якія ўсё больш гучна заяўляюць пра сябе на міжнароднай тэніснай арэне.

Аднак як усё ж мяняецца клімат. Такіх залеваў, якія мы маем апошнія два гады, яшчэ гадоў дзесяць таму нават уявіць сабе не было магчыма. Ужо стала «добрай» традыцыяй, калі ў выніку моцнага дажджу беларуская сталіца пускаецца ў заплыў у літаральным сэнсе гэтага слова. Мне шчыра шкада, напрыклад, супрацоўнікаў крамаў і кавярняў у раёне Старога гораду (вуліцы Няміга, Інтэрнацыянальная, Камсамольская і многія іншыя), якія поўнасцю заліваюцца праз тое, што калектары ў Мінску даўно не адпавядаюць сучасным патрабаванням і не спраўляюцца з аб'ёмамі дажджавой вады.

Даводзілася бачыць, як цяжкія каналізацыйныя люкі, бы папяровыя аркушыкі, узляталі ў паветра пад моцнымі вадзянымі напорамі, а самі вуліцы за пару хвілін пертвараліся ў каналы-рэкі. І хоць гарадскія чыноўнікі абяцаюць мінчукам новыя калектары, але з прычыны вельмі вялікіх коштаў неабходных прац і тэхнічных складанасцяў можна смела прадказваць, што «плаваць» сталіца будзе яшчэ не адзін год. Так што залевы палітычныя ў нашай краіне вельмі добра суседнічаюць з залевамі прыроднымі. І тыя, і другія, часам, вельмі непрыемныя. А вось клімат у Беларусі ўсё больш нагадвае субтропікі, пра што кажуць нават спецыялісты. Дарэчы, сёлетні ліпень, па ацэнках метэаролагаў, можа стаць самым спякотным за апошнія паўстагоддзя.

> Эксперты прадказваюць, што фільм «Хросны бацька», а таксама публікацыі ў расійскіх газетах з'яўляюцца толькі «пробаю пяра», а сапраўдная «інфармацыйная вайна» пачнецца з набліжэннем саміх выбараў кіраўніка Беларусі

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ




### КАЦЯРЫНА КАРСТЭН

У швейцарскім Люцэрне беларуска Кацярына Карстэн здабыла перамогу ў Кубку свету па акадэмічным веславанні. У цяперашнім сезоне спартсменка не пакінула суперніцам ніводнага шанцу. На трох этапах Кубка свету за ёй засталіся абсалютна ўсе гонкі, нават тыя, у якіх паміж першым і другім месцам не было прынцыповай розніцы. На шляху да фіналу яна без праблем выйграла папярэдні і паўфінальны заезды. У вырашальнай гонцы галоўнай канкурэнткай Карстэн стала чэшка Мірка Кнапкова. Фаварыты пачалі заезд вельмі спакойна. На першых пяцістах метрах вяслярка з Чэхіі трымалася на пятым месцы, а Кацярына наогул гэты адрэзак прайшла з горшым часам! Але літаральна некалькіх грабкоў фаварытаў цалкам змянілі сітуацыю. На сярэдзіне дыстанцыі Карстэн ужо ішла наперадзе ўсіх, а Кнапкова яе пераследавала. Аднак на фінішы Кацярына вырвалася наперад, яе перавага — 2,30 секунды, піша «Спартыўная панарама».

Этап у Люцэрне атрымаўся самым прадстаўнічым. Зборную Беларусі прадстаўлялі яшчэ шэсць лодак. Але ніхто, акрамя Кацярыны, у фінал «А» не прабіўся.



### АНДРЭЙ КАБЯКОЎ

Віцэ-прэм'ер Беларусі Андрэй Кабякоў лічыць, што, калі наша краіна патрапіць на 70-е месца ў рэйтынгу Сусветнага банка «Doing Business» па падаткаабкладанні, то гэта будзе «нядрэнным вынікам».

Па словах віцэ-прэм'ера, адмена вялікай колькасці падаткаў не прыводзіць да значнага паніжэння падатковай нагрузкі. У апошняй справаздачы Сусветнага банка «Doing Business» Беларусь па паказчыку «падаткаабкладанне» заняла апошняе, 183-е, месца. «Рэйтынг застаўся самым нізкім, нягледзячы на вялікі аб'ём праробленай працы, у выніку якой было рэалізавана 57 сістэмных мер па спрашчэнні падатковай сістэмы, а падатковая нагрузка была паніжаная больш чым на 4,7 працэнтных пункта», — падкрэсліў Кабякоў, паведамляе БелаПАН. Паводле яго слоў, гэта адбываецца з-за таго, што пры адмене адных падаткаў павялічваецца падатковая база па іншых, «ідзе папаўненне прыбытковай часткі бюджэту». А пазіцыя ў рэйтынгу практычна не змяняецца.

Праблемнымі паказчыкамі па ўмовах вядзення бізнесу, нагадаў Кабякоў, з'яўляюцца таксама «міжнародны гандаль», дзе Беларусь займае 129-е месца, і крэдытаванне — 113-е. Што тычыцца міжнароднага гандлю, то, як адзначыў віцэ-прэм'ер, тут усе прадугледжаныя меры атрымалася рэалізаваць. Нізкае месца ў рэйтынгу ён растлумачыў «рэаліямі сённяшняга дня, калі ў рамках Мытнага саюза даводзіцца ўзгадняць правілы гульні з краінамі, якія па паказчыку «міжнародны гандаль» займаюць зусім не першыя месцы: Расія — 162-е, Казахстан — 183-е».

Па ацэнках Мінэканомікі, Беларусь можа падняцца з 58-га на 48-е месца ў рэйтынгу Сусветнага банка «Doing Business 2011».



### ВАЛЕРЫЙ ГРЫШКАВЕЦ

Паэт Валерый Грышкавец у сваім артыкуле, апублікаваным на сайце Саюза пісьменнікаў Беларусі, назваў вершы Генадзя Бураўкіна рыфмаваным пустазвонствам, а творы Барадуліна — фальшыўкай. У артыкуле «А я веру Чаргінцу, і ў яго новы саюз веру…» Грышкавец выказаўся з нагоды публікацыі у «Дзеяслове» абразкоў Лідзіі Арабей: «Перабежчыкі. Хочацца спытаць у тых, што перабеглі з нашага саюза да Чаргінца: — А вы не баіцёся, што некалі вам скажуць: «Все вы хрюкали возле моего корыта»... Альбо: «Я вас нашёл на помойке».

Грышкавец на гэта адказаў так, што закрануў гонар не аднаго літаратара. «Тады гэтыя «класікі» (Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін) у вершаванай форме кляліся ў вернасці Леніну і партыі, сёння адзін казырае тым, што цалаваў ручку папу Яну, а другі ўсё прысягае на вернасць народу і «мове» — акурат як зусім нядаўна Леніну і партыі…». «Літаральна ўсё, што чытаў напісанае Бураўкіным за апошнія 20 гадоў, не больш, чым рыфмаванае пустазвонства, пісьмо дзеля пісьма: сеў, прыдумаў, напісаў, надрукаваў-выдаў — задаволіў сваё самалюбства». «На мой погляд, апошняя кніга Барадуліна «Ксты» не больш, чым шматстаронкавая, на хуткую руку зарыфмаваная, фальшыўка, такая ж…»… Засумняваўся Грышкавец і ў іншых творцах: «Не веру я і Дракахрустам — ні бацьку, ні сыну. Як зрэшты, Тарасам і ўсякім «фылёзафам» з дэмакратычнага Саюза пісьменнікаў. Не веру «гісторыку» Арлову і «паэтцы» Аксак. Не веру нью-йоркскім гаротнікам З. Пазняку і Сокалаву-Воюшу… А вось генералу, пісьменніку, палітыку і грамадскаму дзеячу Мікалаю Чаргінцу, спадарыня Лідзія Львоўна Арабей, я веру».

ТРЭЦІ СЕКТАР

# МІРАСЛАЎ КОБАСА



Аляксандр ТАМКОВІЧ

**Калі я папрасіў Міраслава Кобасу распавесці пра сваё жыццё, ён пачаў не з даты свайго нараджэння, а з дня стварэння Асветніцкага грамадскага аб'яднання (АГА) «Фонд імя Льва Сапегі». За апошнія гады я задаваў гэта пытанне розным людзям больш за сотню раз, але такую храналогію адказу чуў упершыню…**

## Зорная мара

Сам жа Міраслаў Кобаса нарадзіўся 2 чэрвеня 1954 года ў райцэнтры Даліна Івана-Франкоўскай вобласці. Як і многія юнакі ў 17 гадоў, ён захапляўся фантастыкай і хацеў быць бліжэй да зорак, але астранамічныя ВНУ знаходзіліся ў Кіеве, Маскве, Санкт-Пецярбургу і некаторых іншых далёкіх гарадах. Міраслаў добра разумеў, што з правінцыйным школьным атэстатам (амаль усе выдатныя адзнакі) прабіцца туды практычна не магчыма, таму абраў «астраномію і геадэзію» Львоўскага політэхнічнага інстытута (ЛПІ).

Дарэчы, яго бацька, Уладзімір Дзям'янавіч, 35 гадоў быў нафтавіком. У непасрэдным сэнсе гэтага слова. Нямногія ведаюць, што сваёй нафтай і газам Украіна забяспечвае ўсе насельніцтва гэтай краіны, а купляе іх у Расіі толькі для прамысловасці. Ад роднага дома Кобасы да бліжэйшай буравой вышкі было ўсяго трыста метраў.

Маці, Марыя Сцяпанаўна, 12 першых гадоў жыцця Міраслава выхоўвала яго і сястру, пільнавала дамашнюю гаспадарку, а потым працавала качагарам на базе буравых трубаў.

У Мінск ён трапіў, можна сказаць, з дапамогай «Аэрафлоту». Размеркаванне было «ўсесаюзнае». Спецыяльнасць патрабавала пасля кожнага курса даволі працяглую практыку на вытворчасці. Пасля чацвёртага курса ён паўгода працаваў у беларускай геадэзіі. Там і прапанавалі пайсці пасля сканчэння ЛПІ да іх. Было гэты напрыканцы кастрычніка 1975 года.

Так Міраслаў Кобаса і зрабіў. У маі 1976 года ён са Львова на некалькі гадзін прыляцеў у Мінск, забраў падрыхтаванае запрашэнне, вярнуўся і асабіста аднёс яго ў свой дэканат. Квіток у адзін бок пацягнуў 17 савецкіх рублёў, што было нямала, але мара каштуе значна даражэй.

Ён ніколі не пашкадаваў пра свой жыццёвы выбар, хаця той і меў да зорак даволі ўскоснае дачыненне. Новай прафесіі Кобаса ахвяраваў 14 гадоў жыцця, большая палова з якіх выпала на камандзіроўкі. Там яны жылі па прынцыпу «кожны сам сабе начальнік», і добра ўсведамлялі, што такое сапраўдная свабода.

Зразумела, такі рытм вытрымае не кожная жонка. І тут Міраславу яшчэ раз вельмі пашанцавала. Таццяна скончыла той жа самы факультэт, толькі па спецыяльнасці «інжынерная геадэзія», на два гады пазней за яго і добра ўсведамляла, што яе чакае.

Першыя шэсць гадоў Міраслаў Кобаса працаваў як кіраўнік брыгады, а астатнія восем быў кіраўніком геадэзічнай партыі. Можа, пазней гэта свабода дзеянняў і будзе падмуркам другой свабоды — думак.

## Праз церні да зорак

Пачалося ўсё з таго, што ў 1990 годзе Міраслава Кобасу сярод іншых абралі дэпутатам Мінскага гарадскога савету. Зараз такога не можа быць па вызначэнню, але тады там існавала тры фракцыі — камуністычная, прадэмакратычная, якую ў большасці складалі прадстаўнікі БНФ, і «нейтральная» — тыя, хто ўжо расчараваўся ў КПСС, але пакуль не вызначыўся з палітычнымі прыярытэтамі.

Кобасу абралі старшынёй камісіі па льготах і прывілеях. Там ён зразумеў, што адукацыі не хапае, і пайшоў вучыцца ў БДУ на юрыдычны факультэт. Больш за тое, стала абсалютна відавочна, што для таго, каб нешта змяніць у грамадстве, нельга думаць: «шапкамі закідаем», а ставіцца да ўсяго трэба больш грунтоўна. Менавіта для дасягнення апошняй мэты і было патрэбна нейкае апірышча.

26 чэрвеня 1992 года ініцыятыўная група, у якую ўваходзілі 18 аўтарытэтных для Беларусі (і не толькі) людзей (напрыклад, мастак Алесь Марачкін і пісьменнік Артур Вольскі), правяла ўстаноўчы з'езд адной з самых вядомых сёння арганізацый «трэцяга сектару». Пэўны час пайшоў на падрыхтоўку неабходных папер, і 11 ліпеня 1992 года яе зарэгістравалі ў беларускім міністэрстве юстыцыі.

Тады гэта быў Беларускі рэспубліканскі фонд падтрымкі дэмакратычных рэформаў. А знаёмае нам «імя Льва Сапегі» з'явілася значна пазней. Падчас чарговай перарэгістрацыі, якіх, дарэчы, за 18 гадоў існавання арганізацыі было аж шэсць. Амаль усе пры існуючай уладзе.

Як заўсёды, першапачаткова ў новай структуры былі пэўныя арганізацыйныя складанасці, але ўжо ў 1994 годзе з'явілася магчымасць здымаць офіс, утрымліваць невялікі штат і мець асабістага бухгалтара. Тыя, хто разбіраецца, скажуць, што гэта нямала.

Першым старшынёй праўлення быў вядомы юрыст Георгій Куневіч (былы дэпутат Мінгарсаветf), які сёння выкладае ў БДУ. Кіраваў ён арганізацыяй да 1997 года, калі на гэту пасаду абралі Міраслава Кобасу. А прыйшоў ён туды працаваць 5 мая 1994 года.

Не буду пералічваць усе накірункі дзейнасці арганізацыі, а звярну вашу ўвагу толькі на самыя галоўныя, бо гэта дапаможа зразумець, чаму ўлады лічаць АГА «Фонд імя Льва Сапегі» апазіцыйнай, хаця з самага пачатку падкрэсліваецца, што гэта цалкам апалітычная арганізацыя. Маюцца на ўвазе «развіццё мясцовага самакіравання» і «рэалізацыя правоў грамадзян у лакальнай супольнасці».

## Ад зорак да церняў

Больш-менш нармальна яны працавалі да 1995 года. У той час было 55 дамоваў аб супрацоўніцтве з рознымі мясцовымі ўладамі. Існавалі нармальныя стасункі з камісіяй Вярхоўнага савета па мясцоваму кіраванню (была і такая) і рознымі дзяржаўнымі ўстановамі. А потым пачалі ствараць «вертыкаль».

У рэальнасці гэта адбывалася так. Спачатку ў саветаў розных узроўняў забралі падпарадкаванне выканкамаў і яны засталіся без выканаўчых органаў. Потым пачалося пераманьванне лепшых кадраў у выканаўчыя структуры. Паціху адбіралі асноўныя паўнамоцтвы або прымушалі «дэлегаваць» іх выканкамам. Словам, адбывалася тое, што і было абяцана ў сумна вядомай фразе не весці беларускі народ за цывілізаваным светам. Нічога падобнага нідзе няма. Наадварот.

Наўрад ці знойдуцца тыя, хто можа назваць гэтыя ўмовы спрыяльнымі для дзейнасці структуры, якая займаецца мясцовым самакіраваннем і, тым не менш, яны працавалі. Адбываліся стажыроўкі за мяжой, ажыццяўлялася шмат розных праграмаў. Выбары — канчатковая мэта, галоўнае іншае — зрабіць так, каб іх неабходнасць была рэальнай.

За час дзейнасці АГА «Фонд імя Льва Сапегі» ў іх мерапрыемствах прынялі ўдзел каля 8 тысяч чалавек, апублікавана звыш 30 кніг і брашур, каля 40 аглядаў і бюлетэняў, падрыхтаваныя больш 400 спецыялістаў па самакіраванню. Пагадзіцеся, такой працаздольнасцю можа пахваліцца далёка не кожная структура «трэцяга сектару».

Іх праекты былі патрыманыя такімі вядомымі структурамі, як фонд Сораса, TACIS, фонд Еўразія, MATRA, фонд Эберта, NED, фонд Адэнаўра, SIDA, USAID, Еўракамісія, але гэтымі гучнымі назвамі сёння цяжка каго-небудзь здзівіць. Па-сапраўднаму здзіўляе іншае. АГА «Фонд імя Льва Сапегі» з 2001 года з'яўляецца наглядальнікам на Кангрэсе мясцовай і рэгіянальнай улады Рады Еўропы. Іншымі словамі, працуе там, дзе па гэты дзень няма афіцыйнай Беларусі.

Але прынцыповы момант тут — апалітычнасць арганізацыі, якая не з'яўляецца часткай якой-небудзь партыі. Так, у яе шэрагах ёсць прыхільнікі розных палітычных партый, але гэта асабістая справа кожнага.

Такі расклад, на мой погляд, у першую чаргу і не падабаўся ўладам. З самага пачатку яны «не ляжалі» пад якой-небудзь «дзяржаўнай ідэалогіяй», але і дзейнічаць па прынцыпу «хто не з намі, той супраць нас» улады таксама не маглі, бо «супраць» не датычылася канкрэтных персаналіяў, а накірунку руху.

Не вельмі добра разбіраюся ў карыдзе, але ведаю, што для быка без розніцы, які колер мае тое, чым яго дражняць. Так і тут. Не важна, што нейкія сімвалы афіцыйна зарэгістраваныя ў Беларусі. Галоўнае, што яны выйшлі з тых крыніц, якія нельга назваць падкантрольнымі. На практыцы гэта азначае «что хочу, то и ворочу» любога дзяржаўнага чыноўніка або амапаўца.

## Калі заззяюць зоркі

Паэт Уладзімір Маякоўскі, напэўна, адказаў бы на гэта пытанне: «Калі гэта каму-небудзь будзе трэба». На жаль, сённяшняй уладзе пакуль гэта не патрэбна. Больш за тое, яны цалкам забаранілі ўдзел у мерапрыемствах АГА «Фонд імя Льва Сапегі» не толькі непасрэдным чыноўнікам ад самакіравання, але і тым, хто мае хоць якое-небудзь дачыненне да дзяржавы. Напрыклад, у 2006 годзе за ўдзел у іх семінарах звольнілі двух выкладчыкаў Эканамічнага універсітэта. Самае цікавае, што агучвалі яны тое, што чыталі сваім студэнтам на афіцыйных лекцыях, і ні да якіх рэвалюцыйных зменаў не заклікалі…

Яшчэ раз тлумачыць, чаму абрана менавіта імя Льва Сапегі няма сэнсу, бо амаль усе ведаюць пра дзейнасць канцлера Вялікага княства Літоўскага. А вось пра тое, як гэта імя з'явілася ў назве арганізацыі, ёсць сэнс распавесці больш падрабязна.

1997 год. Думаю, шмат хто ведае, што для таго, каб у любой назве з'явілася прозвішча выдатнага чалавека, пры пэўных умовах трэба дазвол яго нашчадкаў. Міраслаў Кобаса ведаў, што ў той час жылі мінімум двое з іх — у Польшчы і Кеніі. З апошнім і пашанцавала сустрэцца падчас Першага з'езду беларусаў свету. Кобаса патлумачыў сутнасць пытання і атрымаў згоду. Гэта і стала пераважным аргументам.

Нагадаем, розных перарэгістрацый было шмат. Калі прынялі новы Грамадзянскі кодэкс, які падрабязна рэгламентаваў дзейнасць недзяржаўных арганізацый, была ўстаноўлена розніца паміж статусам грамадскіх аб'яднанняў і статусам фондаў. Атрымлівалася, што брэнд давядзецца страціць. Ніхто гэтага не хацеў. Так і з'віласа назва Асветніцкае грамадскае аб'яднанне «Фонд імя Льва Сапегі». І захавалася славутае імя, і сутнасць не змянілася.

Упэўнены, кожны сутыкаўся з тым, што чыноўнікі да нас — дакладней, да тых, хто іх корміць, — ставяцца, мякка кажучы, праз зубы. Пра тое, што так быць не павінна, тлумачыць нікому не патрэбна. А вось што трэба зрабіць? Адказ просты — мясцовае самакіраванне, якім і займаецца арганізацыя Міраслава Кобасы.

САЦЫЯЛОГІЯ

# ГУЛЬНЯ Ў АДНЫ ВАРОТЫ

**Працяг. Пачатак на стар. 1.**

Ды і ўвогуле, гаворыць Аляксандр Сасноў: «Тэрмін «перамога» ў адносінах да беларускай выбарчай кампаніі ўжываць немагчыма, бо ўдзельнікі кампаніі гуляюць па правілах, вызначаных уладамі. Гэта футбол у адны вароты».

## Абяцанні ад першай асобы

Але вернемся да персоны кіраўніка Беларусі. Аляксандр Лукашэнка вядомы сваімі заявамі, якія залежаць ад яго настрою і кан'юнктуры. Сацыёлагі НІСЭПД прааналізавалі адносіны грамадскай думкі да шэрагу заяў, якія зрабіў прэзідэнт у традыцыйным штогадовым пасланні парламенту і народу ў красавіку гэтага года. Пытанне фармулявалася па прынцыпу "згодзен" ці "не згодзен" з нейкай тэзай рэспандэнт. Выявілася, што Лукашэнку, які заявіў, што не дапусціць у краіне «каляровых рэвалюцый», падтрымалі 60,4% апытаных. 51,7% беларусаў згодныя з тым, што «ўлады змаглі зберагчы давер людзей і спакой у грамадстве», 51% мяркуюць, што «ў бягучым годзе беларусы павінны цалкам пераадолець наступствы сусветнага крызісу». 49,1% рэспандэнтаў згодныя, што «двухмоўе — найвялікшы культурны набытак, заснаваны на гістарычным выбары народа», а 45,1% — што «беларускае кіраўніцтва змагло выйсці на якасна новы ўзровень адносінаў з Еўрапейскім саюзам».

Таксама амаль палова рэспандэнтаў (44,9%) згодныя з Лукашэнкам у тым, што нашай краіне неабходная АЭС. 37,7% выказаліся за тое, што «беларусы нікуды не павінні ісці — ні ў Еўропу, ні ў Амерыку, ні ў Расію». Трацiна — 35,2% — вераць, што «ўлада выканае ў бягучым годзе абавязальніцтва па росце заработнай платы» (абяцанне сярэдняга заробку ў 500 долараў).

Усходнюю суседку пакрытыкаваў таксама амаль кожны трэці апытаны: «Дзеянні расійскага кіраўніцтва паставілі пад пытанне выжыванне беларускай дзяржавы», — з такой тэзай пагадзіліся 32,7% рэспандэнтаў. Эксперты НІСЭПД адзначаюць: «Раздача абяцанняў з'яўляецца абавязковым атрыбутам любой улады. Вось толькі дэмакратычнай уладзе за свае абяцанні даводзіцца адказваць. Для гэтага ў дэмакратычных краінах існуюць адпаведныя інстытуты. У Беларусі ўся палітычная сістэма рэдукаваная да інстытута першай асобы. Таму не варта здзіўляцца, што ў тэксце чарговага паслання ёсць пералік задач, але няма справаздачы аб выкананні задач, пастаўленых годам раней».

## Расійскі вектар здаў пазіцыі

Пасля аналізу прарасійскіх сімпатый беларусаў у чэрвені гэтага года, НІСЭПД распаўсюдзіў высновы, што яны былі найменшымі за многія апошнія гады. Апытанне праводзілася да газавага канфлікту, падчас якога ўпершыню з 2004 года Расія рэзка знізіла пастаўкі газу ў Беларусь. Але фактараў, якія працуюць на паніжэнне прарасійскіх сімпатый, хапае і без гэтага. Эксперты называюць студзеньскі нафтавы канфлікт і сваркі паміж Мінскам і Масквой з нагоды прытулку ў Беларусі былога прэзідэнта Кыргызстана Бакіева, транспарціроўку венесуэльскай нафты ды іншыя інцыдэнты.

Як бачна па выніках апытанняў, у чэрвені 2010 года нашы суайчыннікі былі гатовыя зрабіць свой выбар ва ўсходнім накірунку ў найменшай ступені за апошнія дзесяць гадоў. Але разам з тым змяншэнне прарасійскіх настрояў не прывяло да росту праеўрапейскіх. Колькасць тых, хто выступае за далучэнне Беларусі да ЕС, і супернікаў гэтага працэсу практычна не змянілася. За далучэнне да ЕС выступаюць 36,4% рэспандэнтаў, крышку больш — 39,4% — супраць.

Эксперты НІСЭПД зазначаюць, што геапалітычны выбар залежыць ад сацыяльна-дэмаграфічных характарыстык: больш слабыя сацыяльныя групы — жанчыны, асобы старэйшых узростаў і з нізкай адукацыяй — больш схільныя аддаваць перавагу ўсходняму «вектару»; мужчыны, моладзь і адукаваныя рэспандэнты больш імкнуцца да Еўропы.

Разам з тым канстатуецца, што геапалітычныя перавагі беларусаў не вельмі ўстойлівыя: у залежнасці ад фармулёўкі эквівалентных па сэнсу пытанняў, многія рэспандэнты схільныя даваць розныя адказы, рабіць розныя выбары. Прыкладна кожны пяты з прыхільнікаў аб'яднання з РФ або з ЕС змяняе арыентацыю пры пераходзе ад аднабаковых пытанняў да дыхатамічных. Прыкладна ў такіх жа прапорцыях з такім жа пераходам супернікі адпаведнага геапалітычнага выбару становяцца яго прыхільнікамі.

З пазначанага вышэй вынікае, што палітыкі ў пэўнай ступені могуць маніпуляваць гэтым выбарам. Але некаторыя канстанты выбару паміж Усходам і Захадам усё ж застаюцца ў беларускім грамадстве.

**ДЫНАМІКА АДКАЗАЎ НА ПЫТАННЕ «КАЛІ БЫ СЁННЯ ПРАХОДЗІЎ РЭФЕРЭНДУМ АБ АБ'ЯДНАННІ БЕЛАРУСІ І РАСІІ, ЯК БЫ ВЫ ПРАГАЛАСАВАЛІ?», %**

| Дата апытання | За аб'яднанне | Супраць аб'яднання |
|---|---|---|
| 11'99 | 47,0 | 23,8 |
| 12'02 | 53,8 | 26,3 |
| 03'03 | 57,5 | 34,1 |
| 06'04 | 42,9 | 25,0 |
| 11'06 | 46,4 | 33,5 |
| 12'07 | 43,6 | 31,6 |
| 12'08 | 35,7 | 38,8 |
| 03'09 | 33,1 | 43,2 |
| 09'09 | 39,1 | 40,6 |
| 03'10 | 32,1 | 44,5 |
| 06'10 | 29,3 | 48,6 |

ВІЗІТ

# Штэфан Фюле: БЕЛАРУСЬ — САМАЯ ВЯЛІКАЯ ТАЯМНІЦА ЕЎРОПЫ

Генадзь КЕСНЕР

**Еўракамісар па пытаннях пашырэння ЕС і Еўрапейскай палітыкі суседства Штэфан Фюле наведаў Беларусь з двухдзённым візітам. За гэты час у яго адбыліся сустрэчы з прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам, віцэ-прэм'ерам ураду Андрэем Кабяковым, кіраўніком знешнепалітычнага ведамства Сяргеем Мартынавым, а таксама з прадстаўнікамі палітычнай апазіцыі і грамадзянскай супольнасці Беларусі.**



У размове з еўракамісарам, якая доўжылася ледзьве не да дванаццатай гадзіны ночы, узялі ўдзел такія дзеячы, як Яраслаў Раманчук, Аляксандр Мілінкевіч, Андрэй Саннікаў, Віталь Рымашэўскі (варта адзначыць, што гэтыя палітыкі ўжо пазіцыянуюць сябе як патэнцыйныя кандыдаты ў прэзідэнты на наступных выбарах), а таксама Аляксей Янукевіч, Сяргей Калякін, Уладзімір Някляеў, Мікалай Статкевіч і Аляксандр Казулін.

«Чакаецца, што да верасня-кастрычніка Еўрасаюз выпрацуе дакумент кшталту «дарожнай карты» ў дачыненнях з Беларуссю, у якім будуць прапісаны абавязацельствы Брусэля і Мінска», — паведаміў намеснік старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі Яраслаў Раманчук і зазначыў, што Штэфан Фюле выслухаў прапановы беларускіх апазіцыянераў па ўключэнню ў гэты дакумент тых ці іншых пунктаў.

Таксама еўракамісар даў паўгадзіннае інтэрв'ю Беларускаму тэлебачанню, падчас якога распавёў пра перспектывы развіцця Еўрасаюза, магчымасці, якія дае ратыфікаванае Лісабонскае пагадненне, а таксама пра надзейнасць беларускай мяжы ў справе барацьбы з міжнародным тэрарызмам. Што да Беларусі, то, па словах Штэфана Фюле, наша краіна з'яўляецца «самай вялікай таямніцай Еўропы». Беларуская таямніца, з пункту гледжання еўракамісара, хаваецца не ў больш танных нафце і газе, якія пастаўляюцца з Расіі, і нават не ў прапановах ЕС з самымі найлепшымі намерамі. «Вельмі адукаванае грамадства з шырокім кругаглядам» — вось у чым Штэфан Фюле бачыць «таямніцу Беларусі».

Еўракамісар заклікаў афіцыйны Мінск «скарыстацца магчымасцю і ўмацаваць стасункі Беларусі і Еўрасаюза. Двухбаковае ўзаемадзеянне, па словах Фюле, залежыць ад таго, наколькі краіна паважае тое, што ёсць асновай «Усходняга партнёрства», — вяршэнства закона, належнае кіраванне, дэмакратыя і правы чалавека. Еўрасаюз чакае, што ў Беларусі не будзе палітзняволеных, а выбары будуць прызнаныя свабоднымі і справядлівымі.

Што да чэрвеньскай «газавай вайны» Беларусі і Расіі, у выніку якой часткова пацярпелі некаторыя еўрапейскія дзяржавы, то спадар Фюле заклікаў вырашаць падобныя праблемы на двухбаковым узроўні, а не за кошт еўрапейскіх спажыўцоў.

На прэс-канферэнцыі па выніках візіту Штэфан Фюле адзначыў, што ўсе краіны-ўдзельніцы «Усходняга партнёрства» ацэньваюцца Еўрасаюзам «не з пункту гледжання іх гістарычных адметнасцей», але на падставе таго, «ці ёсць пазітыўны прагрэс, імкненне і амбіцыі дзяржавы да рэформаў». «Чым больш дзяржава гатова рэфармаваць краіну, тым большую падтрымку яна можа чакаць ад нас», — заявіў еўракамісар.

«Выбары з'яўляюцца дэмакратычнай пячаткай на замежным пашпарце краіны. Беларусі вельмі патрэбна гэта пячатка, — падкрэсліў Штэфан Фюле. — Падчас сустрэч мы таксама гаварылі пра смяротнае пакаранне, бо Беларусь з'яўляецца адзінай краінай у Еўропе, дзе прымяняецца смяротнае пакаранне ў дачыненні да ўласных грамадзян».

Зараз у Брусэлі распрацоўваецца так званы «Сумесны прамежкавы план», які, па словах еўрачыноўніка, з'яўляецца не прававым, але палітычным дакументам. «Гэта наша спроба стварыць рамкі для білатэральных зносінаў ЕС і Беларусі», — адзначыў Штэфан Фюле.

Еўрасаюз па-ранейшаму чакае паляпшэння сітуацыі ў Беларусі па пяці пунктах — гэта адсутнасць палітычных зняволеных, свабода асацыяцый, свабода прэсы, адмена смяротнага пакарання і выкананне рэкамендацый БДІПЧ АБСЕ па правядзенню выбараў.

Штэфан Фюле паведаміў, што на парадку дня двухбаковых стасункаў важным з'яўляецца пытанне спрашчэння візавага рэжыму для грамадзян Беларусі. «Зараз у Брусэлі вядзецца падрыхтоўка прапаноў для мандата дэлегацыі Еўрасаюза на перамовах па рэадмісіі, па спрашчэнню парадку выдачы віз. Больш грунтоўнае абмеркаванне гэтага пытання ў Брусэлі чакаецца ў верасні-кастрычніку бягучага года», — адзначыў еўракамісар. Паводле яго слоў, працэдура спрашчэння візавага рэжыму для беларусаў можа распачацца ўжо пры канцы 2010 года.

Еўракамісар не пажадаў раскрываць журналістам падрабязнасці сваіх сустрэч з кіраўніком дзяржавы і высокімі службовымі асобамі краіны. Пра сваю сустрэчу з Аляксандрам Лукашэнкам Штэфан Фюле толькі заўважыў, што «гэта была адкрытая і шчырая размова як пры тэлекамерах, так і без іх». Але звярнуць увагу ўсё ж ёсць на што, калі глядзець сюжэт пра сустрэчу Фюле з Лукашэнкам, паказаны дзяржаўнымі тэлеканаламі.

Прэзідэнт Беларусі літаральна ашаламіў высокага еўрапейскага госця сваімі рэзкімі выказваннямі. «Мы не ўпадзем, не будзем поўзаць на каленях ні перад кім — ні перад вамі, ні перад Расіяй, ні перад Амерыкай… Давайце дамовімся, што галоўнае — гэта наш суверэнітэт, бяспека і незалежнасць нашай краіны… У імя гэтай незалежнасці мы будзем рабіць усё. Мы не будзем бегаць па Еўропе, Амерыцы, Расіі, браць у вас грошы… Хачу папярэдзіць ад залішніх чаканняў: Беларусь будзе рухацца сваім шляхам», — сказаў як адрэзаў афіцыйны беларускі лідэр. Тут кіраўнік дзяржавы меў на ўвазе пазіцыю чакання, якую занялі многія еўрапейскія і расійскія палітыкі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі.

Штэфан Фюле яўна разлічваў на іншую атмасферу прыёму — варта ўзгадаць, з якім імпэтам у Мінску сустракалі такіх «еўразуброў», як Хав'ер Салана і Беніта Ферэра-Вальднер. Цяпер, улічваючы чарговае беларуска-расійскае сезоннае абвастрэнне, еўракамісару таксама можна было б разлічваць на цеплыню з боку беларускага прэзідэнта. Але атрымалася наадварот — Аляксандр Лукашэнка быў рэзкі, адназначны і бескампрамісны. Можна толькі здагадвацца, пра што гаварылі Лукашэнка і Фюле за зачыненымі дзвярыма, але, гледзячы па настрою еўракамісара на выніковай прэс-канферэнцыі, асабліва поспеху яго візіт у Мінск не меў, і новага прарыву ў дачыненнях Беларусі і Еўрасаюза не адбылося.

ЭКАЛОГІЯ

# ПРЫНАДА ДЛЯ «ЗЯЛЁНАГА» ТУРЫСТА

Вольга ХВОІН

**Паўночная Беларусь — край дзікі і малавядомы нават беларусам. На памежнай з Расіяй Віцебшчыне знаходзіцца зона паўднёвай тайгі, то бок прыродны пераход да шыракалістых лясоў. А на лясной сцежцы тут можна сустрэць і мядзведзя, і рысь. Уласна, гэтыя адметнасці і прываблiваюць на Расоншчыну «зялёных» турыстаў як з самой Беларусі, так і з акультуранай Еўропы.**


Фота Алёны Садоўскай
Дзмітрый Шамовіч

На самай поўначы Беларусі на тэрыторыі Расонскага раёна месцяцца два заказнікі рэспубліканскага значэння «Чырвоны бор» і «Сіньша». Але не толькі падлікам птушак займаюцца супрацоўнікі створанай на базе заказнікаў дзяржаўнай прыродаахоўнай установы «Эка-Росы», але і развіццём зялёнага турызму. Магчыма, варта было б пакінуць гэту дзейнасць прыватным структурам, але зацікаўленых у прэзентацыі дзікіх куткоў Беларусі пакуль не назіраецца.

## «Кухня» айчыннага экатурызму

«У Расонскім раёне шчыльнасць насельніцтва адна з самых нізкіх у рэспубліцы. Але на прыродным патэнцыяле рэгіёна гэта адбіваецца пазітыўна, — расказвае спецыяліст ДПУ «Эка-Росы» Дзмітрый Шамовіч. — Адна з нашых задач — развіццё экалагічнага турызму. Паколькі мы — прыродаахоўная арганізацыя, то наш турызм зялёны, экалагічны. Але, як паказаў досвед, зрабіць экалагічны турызм рэнтабельным толькі на адной прыродаахоўнай тэрыторыі немагчыма. Таму «Эка-Росы» імкнецца супрацоўнічаць з рознымі ахоўваемымі прыроднымі тэрыторыямі Беларусі, найперш з Бярэзінскім біясферным запаведнікам і Прыпяцкім рэгіёнам. З апошнім зараз ствараем агульны турыстычны прадукт, з дапамогай якога будзем спрабаваць прасоўваць экатурызм на поўдні Беларусі».

Пачатак размовы пра экалагічны турызм на Паўночнай Беларусі быў на пазітыўных нотках, але высветлілася, што справа гэта трымаецца не на прамысловай плыні, а на прыватных кантактах.

«У нас ёсць турыстычная ліцэнзія, каб прадаваць свой прадукт унутры краіны і за яе межамі. Але цяпер адначасова мы можам абслугоўваць толькі адну групу турыстаў, бо працуе толькі адзін спецыяліст такога профілю. Праблема ў тым, што для арганізацыі экалагічнага турызму патрэбныя адмыслоўцы, а ў нас пакуль толькі адна штатная адзінка, якая можа гэтым займацца, — расказвае Шамовіч пра «кухню» экатурызму. — Да таго ж тэрыторыя заказніка — гэта не заапарк, ёсць абмежаванні па сезоне. Самыя гарачыя сезоны па наведвальнасці турыстаў — вясна, пачатак лета, а таксама ранняя восень. Можна было б пашырыць гэты сезон, але існуе шэраг аб'ектыўных цяжкасцяў. Напрыклад, у нас ёсць магчымасць арганізаваць назіранні за бурым мядзведзем. На тэрыторыі заказнікаў «Сіньша» і «Чырвоны Бор» ёсць пэўная папуляцыя гэтага звера, можа і не такая ўжо вялікая, але існуюць методыкі, якія дазваляюць прываблiваць мядзведзя, ладзіць назіранне за ім. Такі бізнес добра наладжаны ў Скандынавіі, Балгарыі, Румыніі, Эстоніі. Існуе методыка, якая дазваляе прыцягваць мядзведзя ў вызначаную кропку ў лесе за кошт, напрыклад, штотыднёвага выкладвання прынады. Мы б таксама маглі яе выкарыстаць, але ў прынаду часта ўваходзяць мясныя адыходы. Паводле ж нашага прыродаахоўнага заканадаўства і правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі, іх прымяненне забаронена. Мы спрабавалі ўзгадніць гэта пытанне з Мінпрыроды і нават спачатку атрымалі згоду, але потым нам адмовілі. Так што наконт мядзведзя мары пакуль застаюцца нерэалізаванымі».

Яшчэ адна мара спецыяліста з паўночных лясоў Беларусі — паказаць цікаўным людзям рысь. На тэрыторыі Расонскага раёна, па дадзеных Акадэміі навук, жыве каля 45 асобінаў рысі. У Еўропе гэту жывёлу ніхто не паказвае аматарам экалагічнага турызму, бо гэта майстэрства вышэйшага пілатажу, і зладзіць сустрэчу з ёй праблематычна. Рысь — актыўны драпежнік, яна харчуецца толькі свежым мясам, таму выкладваць ёй прынады малаэфектыўна. Але ў той жа Канадзе ёсць методыкі, якія вельмі паспяхова ўжываюць мясцовыя паляўнічыя. З найбольш простых — выкарыстанне радыёперадатчыкаў. Калі рысь так пазначыць, то яе прасцей знайсці. «Думаю, што ў будучым мы зможам прапанаваць такія туры па назіранню за лясной коткай», — цешыць свае амбіцыі Дзмітрый Шамовіч.

І адразу тлумачыць, што арганізатары «зялёных» маршрутаў сутыкаюцца не толькі з заканадаўчымі абмежаваннямі па тыпу «класці мяса на прынаду зверу ці не», але і арганізацыйнымі. Заказнік знаходзіцца ў падпарадкаванні розных устаноў, якія пераследуюць свае мэты. Землеўласнікам, да прыкладу, з'яўляецца лясгас, шэраг азёраў арэндуецца рознымі арганізацыямі. І з-за такога перакрыжаванага падпарадкавання ўзнікаюць супярэчнасці, бо кожны мае свае інтарэсы.

## На асабістых знаёмствах

«У нас асабістыя сувязі, кантакты з турапаратарамі. Іх прадстаўнікі былі тут, усё бачылі на свае вочы, — раскрывае асаблівасці турызму ў дзікія краі спецыяліст. — Усё найперш трымаецца на асабістых кантактах з замежнымі турапаратарамі. Калі б з'явілася магчымасць, працавалі б з кліентамі наўпрост, без пасярэднікаў. Але пакуль гэта наўрад магчыма, бо ўзнікаюць пытанні з аплатай, ды і турапаратару значна прасцей арганізаваць групу ў сваёй краіне, чым нам каардынаваць з Расоншчыны дзеянні людзей».

Апошнім часам ініцыятары экатурызму працавалі над стварэннем фотатураў па поўдні Беларусі. Традыцыйна да нас прыязджаюць людзі, якіх цікавяць птушкі — совы, дзятлы, дзённыя драпежнікі — беркут, арлан-белахвост, змееяд, скапа, малы і вялікі падворлікі, а таксама глушцы, некалькі відаў дробных вераб'іных. У наступным годзе чакаюць групу прафесійных фатографаў з Галандыі.

Дарэчы, Беларуссю зацікавіўся і вядомы натураліст Найджэл Марвін, які працуе на *BBC* ды здымае яркія стужкі пра прыроду Зямнога шару. Ёсць верагоднасць, што ў наступным годзе Найджэл Марвін пачне здымкі на тэрыторыі заказнікаў «Сіньша» і «Чырвоны Бор». Дзмітрый Шамовіч гаворыць, што калі б гэты фільм выйшаў, то зялёны турызм займеў бы падтрымку — было б што паказваць патэнцыйным турыстам, усё ж узровень стужак *BBC* вельмі высокі.

## Цывілізацыя ад ПРААН

Сустрэча з Дзмітрыем Шамовічам была акурат у дзень, калі ў вёсцы Забор'е Расонскага раёна адчыняўся інфармацыйны пункт па ўстойліваму развіццю і экалагічнаму турызму. Ініцыятыву гэту падтрымаў мясцовы выканкам, а таксама ПРААН, з фінансавай дапамогай якога ў лясны край прыйшлі сучасныя падыходы да арганізацыі экалагічнага турызму. Праўда, Шамовіч прызнаўся, што досведу працы падобнай установы пакуль бракуе, таму і цяжка ўявіць, як гэта будзе садзейнічаць развіццю экатурызму.





«Яшчэ думаю, што дзяржаўнае прыродаахоўнае прадпрыемства не мусіць займацца зялёным турызмам. Турыстычны бізнес мусіць быць прыватным, гнуткім. Напрыклад, у такой галіне няма жорсткага працоўнага дня. Калі мне трэба ўбачыць глушца — давядзецца падняцца ў тры гадзіны ночы, а працоўны працэс арганізоўваецца па іншай сістэме», — рэзюмуе спецыяліст «Эка-Росаў».

Кіраўніца «Эка-Росаў» Ала Хорань з'яўляецца адной з пачынальнікаў вясковага турызму на Расоншчыне. Таму да адкрыцця інфармацыйнага цэнтру ў Забор'і паставілася аптымістычна. «У адбудаваным доме будзе некалькі пакояў для валанцёраў, людзей, якія па справах сюды прыедуць. Вёска не з'яўляецца аграгарадком, таму інфацэнтр будзе аказваць паслугі кшталту перадаць факс, скарыстаца інтэрнэтам. Праз паўгода інфармацыйны цэнтр мусіць перайсці на самаакупальнасць, — расказвае пра працоўныя планы Ала Мікалаеўна. — Летась аграсядзібы прыцягнулі за кошт сваёй дзейнасці 185 мільёнаў рублёў. Невялікія грошы ў маштабах раёна, але паказчык добры. Сёлета з наведвальнасцю не густа, думаю, што звязана гэта з эканамічным крызісам. Як ва ўсіх, так і ў нас».

Дзмітрый Шамовіч, разважаючы пра ўзровень мясцовага побыту ды сэрвісу, гаворыць, што інфраструктуру ў раёне не зашкодзіла б падцягнуць. Цяпер тут дзейнічае каля дваццаці аграсядзіб, але ўзровень сэрвісу ў іх мог бы быць лепшым. «З іншага боку, добра, што хоць бы такія ёсць. Галава не баліць, дзе размясціць турыстаў, чым іх накарміць. Мясцовае насельніцтва пакуль не вельмі актыўна працуе ў сферы экатурызму, бо не бачыць выгады. Расоншчына — лясны край. Кожны пяты жыхар працуе ў структуры лясгаса, частка насельніцтва занятая ў паляўнічай гаспадарцы. Сітуацыя зменіцца толькі тады, калі з'явіцца відавочныя перавагі ад працы на ніве экалагічнага турызму», — дзеліцца сваімі назіраннямі Шамовіч.

А вось інфармацыя для цікаўных: замежніку прыехаць на фотапаляванне на Расоншчыну каштуе ад 60 да 100 еўра за суткі з чалавека. Сюды ўваходзяць транспарт, візавая падрыхтоўка, дапамога ў назіраннях за жывёламі. Беларусу такая паслуга будзе больш танная. Можна і ўвогуле дзікуном паехаць, тым самым зэканоміць грошы, але да спецыялістаў за кансультацыяй усё ж варта звярнуцца. І месцы добрыя пакажуць, і парады карысныя дадуць. Тым больш, што людзі на сваім месцы — справу любяць, Расоншчыну ведаюць.

Цікава, што Дзмітрый Шамовіч раней жыў у Мінску, вучыўся ў аспірантуры НАН Беларусі. А пасля з'ехаў у глухі край, і на лёс не скардзіцца. «Лепш не бывае — менш народу, больш кіслароду. Сталіцу я, канечне, наведваю, але тут добра», — рэзюмуе піянер зялёнага турызму на Поўначы Беларусі.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 19 ліпеня, панядзелак

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** У свеце матораў.
**09.05** Nota Bene.
**09.35** Здароўе.
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Вандраванні для мяне раскоша».
**11.05** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**12.10** Камедыя «Супергеройскае кіно».
**13.40** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна). Фільм «Святлана Кручкова. Жанчына-ваяр».
**14.30** Відэафільм «У пагоне за марай».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Меладраматычны серыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу» (Расія).
**16.30** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-2».
**17.30** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.25** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**18.50, 01.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНА».
**19.30** Відэафільм АТН «Галіна Арлова» цыклу «Лёгка сказаць».
**19.55** Камедыйны дэтэктыў «Участак» (Расія). 1-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Фантастычны трылер «Імгла» (ЗША).
**00.15** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША).
**01.05** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.05, 01.05** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Гарады-героі. Ленінград».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.20, 01.20** Навіны спорту.
**11.10** «Гарады-героі. Ленінград». Працяг.
**11.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**12.00** «Малахаў+».
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**16.15** «Заручальнае кольца». Шматсерыйны фільм.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**21.05** «Ермолавы». Шматсерыйны фільм.
**22.05** «Застацца ў жывых». Шматсерыйны фільм. V сезон. 7-я серыя.
**23.25** «Алімпіяда-80. Перамагчы любым коштам».
**00.20** «Размаўляючая са зданямі».

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень». І
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Асабістая цікавасць» з Паўлам Каранеўскім.
**10.40** Тэленавела.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**15.35** «Зорны рынг».
**16.50** «Рэпарцёрская гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.40** «Кінапанядзелак»: «СУВЯЗЬ». Расія, 2006 г.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** «Кіно»: «Пяты элемент». Францыя, 1997 г.

---

**07.00** Добрая раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Камедыйная меладрама «Коля - перакаці поле» (Расія).
**12.15** «Пра мастацтва».
**12.45** Школа рамонту.
**13.45** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.35** Пазакласная гадзіна.
**14.50** Тэлебарометр.
**15.10** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**15.40** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Медычныя таямніцы.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Серыял «Анатомія Грэй-4» (ЗША).
**19.55** Іранічны дэтэктыў «Цень самурая» (Беларусь-Расія). 1-я серыя.
**21.00** Калыханка.
**21.20** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**21.55** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**22.45** Прэм'ера. Крымінальны баявік «Зграя» (Расія). 1-я і 2-я серыі.
**00.20** Альбарутенія.

---

РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.25** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.20** «Ранішняя пошта з Ларысай Грыбалёвай».
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** «Сусветны патоп як прадчуванне». Дакументальны фільм.
**12.15** «Трэці лішні». 2007 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** «Восеньскія клопаты». 2009 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карметіта. Цыганскія жарсці». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Вера, Надзея, Любоў».
**22.20** «Дворык».
**22.55** Тэлесерыял «Каменская».
**23.50** «Нічога асабістага».
**00.05** Навіны - Беларусь.
**00.15** «Весткі.ru».
**00.30** Прэм'ера. «Гарадок».

---

НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.25** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** Вострасюжэтны серыял «Таксіст».
**09.15** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.20** «Руская сенсацыі».
**12.05** Серыял «Крымінальнае відэа».
**13.30** Крымінальны дэтэктыў «Мужы».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Крымінальны серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Сталіца граху».
**21.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**23.50** Моладзевы серыял «Школа».
**00.20** «Алімпійскія таямніцы Расеі». Фільм Кірылу Набутава.

---

EUROSPORT

**09.30** Матаспартовы часопіс.
**09.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Брэндс Хэтч (Вялікабрытанія).
**10.15** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Аўстрыя-Англія. Францыя.
**11.15, 01.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс.
**12.10, 15.10, 00.25, 02.25** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**12.15** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Францыя-Нідэрланды. Францыя.
**13.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Этап 14.
**15.15** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Этап 15.
**18.30** Футбол. Таварыскі матч.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Этап 15.
**21.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Францыя-Нідэрланды. Францыя.
**21.50** Вось дык так!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Агляд.
**00.30** Футбол. Таварыскі матч.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**07.40, 20.05** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**08.05** Басанож па свеце.
**08.30** Побач з намі (тэлечасопіс).
**08.45** Дакументальная гадзіна: «Кіно і катлеты», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**10.00** Вагон.
**10.10** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 3 серыя.
**10.55** «Загадкі Мэрдака», серыял.
**11.40** Фільматэка майстроў: «Пад покрывам нябёсаў», маст. фільм.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял.
**17.30** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 3 серыя.
**18.15** Аўтастопам праз Еўропу: «Прага».
**18.35** «Беларускі лес», дак. фільм, 2008 г.
**19.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.30** «Надзвычай прыгодніцкія падарожжы Цюхці», мультсерыял.
**19.35** Еўропа сёння.
**20.30** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Казка», дак. фільм, 2005 г., Польшча–Расія.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Прыватная калекцыя.
**21.40** Фільматэка майстроў: «Пад покрывам нябёсаў.
**23.55** Аб'ектыў.

## 20 ліпеня, аўторак

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.40, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.45** Відэафільм АТН «Усё гэта было».
**09.05** Камедыйны дэтэктыў «Участак» (Расія). 1-я серыя.
**10.00** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-2».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.35** «OFF STAGE LIFE» з Вадзімам Мезгой.
**12.10** Меладрама «Туды, дзе жыве шчасце».
**13.55** «Залатыя Віцязі» славянскага брацтва». Перадача 2-я.
**14.30** Альманах вандраванняў.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Галіна Арлова» цыклу «Лёгка сказаць».
**15.55** Меладраматычны серыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу» (Расія).
**16.50** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-2».
**17.45** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.30** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНА».
**19.30** «Сфера інтарэсаў».
**19.55** Камедыйны дэтэктыў «Участак».
**21.00** Панарама.
**21.55** Моладзевы музычны фільм «Крок наперад-2: Вуліцы» (ЗША).
**23.40** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША).
**00.40** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** «Вандраванне мсье Перышона».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Вандраванне мсье Перышона». Працяг.
**11.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальнае кольца». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ермолавы». Шматсерыйны фільм.
**22.10** «Выклік-4». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорт.
**23.30** «Алег Анофрыеў. Паміж мінулым і будучыняй».
**00.25** «Размаўляючая са зданямі».
**01.10** Нашы навіны.
**01.25** Навіны спорту.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Кіно»: «СУВЯЗЬ». Расія, 2006г.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** Тэленавела.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Гучная справа».
**14.40** «Next». Серыял. Заключная серыя.
**15.40** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** ПРЭМ'ЕРА! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** ПРЭМ'ЕРА! «Черкізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**22.55** «Аўтапанарама».
**23.15** «Брыгада». Серыял.

---

**07.00** Добрая раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Серыял «Анатомія Грэй-4» (ЗША).
**11.30** Дак. фільм «Гісторыя жартуе».
**11.55** «Корцік». 1-я серыя.
**13.15** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.10** Мультсерыял «Доктар Дог».
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.00** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**15.30** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Медычныя таямніцы.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Серыял «Анатомія Грэй-4» (ЗША).
**19.55** Іранічны дэтэктыў «Цень самурая» (Беларусь-Расія). 2-я серыя.
**21.00** Калыханка.
**21.20** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**21.55** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**22.45** Крымінальны баявік «Зграя» (Расія).
**00.20** Спорт-кадр.
**00.45** Альбарутенія.

---

РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Таямніца згубы «Пахтакора». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага».
**11.45** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**12.40** Тэлесерыял «Каменская».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Тэлесерыял «Вера, Надзея, Любоў».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карметіта. Цыганскія жарсці». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Вера, Надзея, Любоў».
**22.20** Ттэлесерыял «Дворык».
**22.55** Тэлесерыял «Каменская».
**23.55** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі.ru».
**00.15** Дакументальны фільм.

---

НТВ

**07.00, 10.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** Вострасюжэтны серыял «Таксіст».
**09.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.20** «Кватэрнае пытанне».
**11.20** «Вочная стаўка».
**12.05** Серыял «Крымінальнае відэа».
**13.00** Сёння.
**13.30** Крымінальны дэтэктыў «Мужы».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Сталіца граху».
**21.35** Максім Аверин і Дзяніс Ражкоў у дэтэктыўным серыяле «Глушэц».
**23.25** Сёння.
**23.50** Моладзевы серыял «Школа».
**00.20** «Масквічы».

---

EUROSPORT

**09.30** «Алімпійскія гульні». Алімпійскі часопіс.
**10.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Францыя-Нідэрланды. Францыя.
**11.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Памье-Баньере-дэ-Лушон. Францыя. Этап 15.
**12.25, 23.55, 02.25** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**12.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Баньере-дэ-Лушон-Па. Этап 16.
**18.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Францыя-Германія. Германія.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Баньере-дэ-Лушон-Па. Этап 16.
**21.00** Футбол. Таварыскі матч.
**23.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Агляд.
**00.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
**00.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Францыя-Германія. Германія.
**01.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Еўропа сёння.
**07.50** Прыватная калекцыя.
**08.10** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**08.25** Аўтастопам праз Еўропу: 7 серыя, «Прага».
**08.45** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**09.10** «Беларускі лес», дак. фільм, 2008 г.
**09.40** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Казка», дак. фільм, 2005 г., Польшча–Расія.
**10.05** «Папялушка», тэлесерыял: 28 серыя.
**10.30** «Мент», дэтэктыўны серыял: 7 серыя.
**11.25** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**11.35** «Girl guide», маст. фільм, рэж. Юліюш Махульскі, 1995 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял: 29 серыя.
**17.30** «Год каметы», прыгодніцкая камедыя, рэж. Пітэр Ейтс, 1992 г., ЗША.
**19.00** «Бульбаны», мультсерыял.
**19.10** Госць «Белсату»: Алена Кірэева.
**19.30** «Надзвычай прыгодніцкія падарожжы Цюхці», мультсерыял.
**19.35** Праект «Будучыня».
**20.05** Дакументальная гадзіна: «Край светлых мрояў», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Апошні сезон», серыял: 6 серыя.
**22.15** Жаўтуха (сатырычная праграма).
**22.40** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 21 ЛІПЕНЯ, СЕРАДА

**[Першы канал]**

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05** Дэтэктыў «Участак». 2-я серыя.
**10.00** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-2».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Відэафільм АТН «Магілёўскія відарысы» цыкла «Зямля беларуская».
**12.10** Прэм'ера. Дэтэктыўная меладрама «Халоднае сонца» (Расія).
**14.15** «OFF STAGE LIFE» з Уладзімірам Жбанавым.
**14.30** Хранікальна-дак. фільм «Гвардыя. Баявыя традыцыі». Закл. серыі.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.55** Меладраматычны серыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу» (Расія).
**16.50** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-2».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.30** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНА».
**19.35** «Зямельнае пытанне».
**20.00** Дэтэктыў «Участак». 3-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Драма «У бегах» (Італія).
**23.40** Фантастычны серыял «Героі-3».
**00.40** Дзень спорту.

**[АНТ]**

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10, 01.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Выклік-4». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Мікі Маўс. Хатні клуб».
**11.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**12.00** «Малахаў +».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальнае кальца». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ермолавы». Шматсерыйны фільм.
**22.10** «Выклік-4». Шматсерыйны фільм.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Дэ Голь. Апошні вялікі француз».
**00.25** «Размаўляючая са зданямі».
**01.25** Навіны спорту.

**[СТБ]**

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** Тэленавела.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**14.40** «Next 2». Серыял.
**15.35** «Черкізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** «Черкізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**22.55** «Калі ласка, скардзіцеся».
**23.15** «Брыгада». Серыял.

**[ЛАД]**

**07.00** Добрая раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Серыял «Анатомія Грэй-4» (ЗША).
**11.20** Спорт-кадр.
**11.55** Дакументальны фільм «Гісторыя жартуе» (ЗША-Канада).
**12.15** «Корцік». 2-я серыя.
**13.35** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.35** Мультсерыял «Доктар Дог».
**14.45** Пазакласная гадзіна.
**15.00** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**15.30** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Медычныя таямніцы.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Камедыйная драма «Анатомія Грэй-4» (ЗША). Заключная серыя.
**20.00** Іранічны дэтэктыў «Цень самурая».
**21.10** Калыханка.
**21.25** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**22.50** Крымінальны баявік «Зграя» (Расія).
**00.25** Альбарутенія.

**[РОССИЯ]**

**07.00** «Журботная дама чарвякоў». Расія.
**08.35** «Пакой смеху».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Лепшыя песні-2009».
**12.25** Тэлесерыял «Каменская».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Тэлесерыял «Вера, Надзея, Любоў».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскія жарсці». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Вера, Надзея, Любоў».
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Тэлесерыял «Каменская».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі.ru».
**00.15** «Рускія ў Югаславіі. Паміж молатам і кавадлай».

**[НТВ]**

**07.00-08.35** Тэхнічная прафілактыка.
**08.35** Вострасюжэтны серыял «Таксіст».
**09.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.25** Сёння.
**10.20** «Дачны адказ».
**11.20** «Следства вялі…».
**12.05** Серыял «Крымінальнае відэа».
**13.30** Крымінальны дэтэктыў «Мужы».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Сталіца граху».
**21.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**23.50** Моладзевы серыял «Школа».
**00.20** «Масквічы».

**[EUROSPORT]**

**09.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Францыя-Германія. Германія.
**11.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Баньере-дэ-Лушон-По. Этап 16.
**12.25** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**12.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. КНДР-Швецыя. Германія.
**13.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Новая Зеландыя-Бразілія. Германія.
**14.45** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Францыя-Германія. Германія.
**16.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Іспанія-Партугалія. Францыя.
**18.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Японія-Англія. Германія.
**19.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Нідэрланды-Англія. Францыя.
**19.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.55** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Нідэрланды-Англія. Францыя.
**21.00** Выбранае па серадах.
**21.05** Конны спорт. Турнір па канкуру Hippique International Officiel (Германія).
**22.05** Конны спорт. Кубак нацый (Германія).
**23.05** Навіны коннага спорту.
**23.10** Выбранае па серадах. Госць тыдня.
**23.20** Гольф. Тур PGA. Турнір Reno Tahoe Open. Рэно (ЗША).
**00.20** Гольф. Еўратур. Адчынены чэмпіянат Шатландыі. Вялікабрытанія.
**00.50** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**00.55** Яхт клуб. Навіны ветразнага спорту.
**01.00** Выбранае па серадах.
**01.15** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
**01.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Нідэрланды-Англія. Францыя.

**[БЕЛСАТ tv]**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня».
**07.50** Госць «Белсату»: Алена Кірэева.
**08.05** Дакументальная гадзіна: «Край светлых мрояў», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**08.55** «Апошні сезон», серыял: 6 серыя.
**09.50** «Бульбаны», мультсерыял.
**10.00** «Папялушка», тэлесерыял: 29 серыя.
**10.25** Жаўтуха (сатырычная праграма).
**10.55** «Год каметы», прыгодніцкая камедыя, рэж. Пітэр Ейтс, 1992 г., ЗША.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял: 30 серыя.
**17.30** «Апошні сезон», серыял: 6 серыя.
**18.25** Невядомая Беларусь: «Кіпіць Нямі-га», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**18.55** Хто ёсць кім: Валерый Леванеўскі.
**19.15** Паляванне на дзівосы.
**19.30** «Надзвычай прыгодніцкая падарожжы Цюхці», мультсерыял.
**19.40** «На колах».
**20.10** Прыватная калекцыя.
**20.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.40** Побач з намі (тэлечасопіс).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Ніжэй за лінію Казярога», маст. фільм, 1983 г., Аўстралія. 1 серыя.
**23.00** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы.
**23.10** Аб'ектыў.

## 22 ЛІПЕНЯ, ЧАЦВЕР

**[Першы канал]**

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Зямельнае пытанне».
**09.05** Камедыйны дэтэктыў «Участак» (Расія). 3-я серыя.
**10.00** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-2».
**10.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.35** «OFF STAGE LIFE» з Паўлам Сыраежкіным.
**12.10** Вострасюжэтная меладрама «Курортны раман» (Расія).
**13.50** Дакументальны цыкл «Фартыфікацыя» (Беларусь).
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Уласны персанал.
**15.55** Меладраматычны серыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу» (Расія).
**16.50** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-2».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНА».
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Камедыйны дэтэктыў «Участак» (Расія). 4-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** «Актуальнае інтэрв'ю».
**22.05** Меладрама «Вандраванне з хатнімі жывёламі» (Расія).
**00.00** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША).
**00.50** Дзень спорту.

**[АНТ]**

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Выклік-4». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Мікі Маўс. Хатні клуб».
**11.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальнае кальца». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ермолавы». Шматсерыйны фільм.
**22.10** «Выклік-4». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Чаму ўсё так дорага».
**00.25** «Размаўляючая са зданямі».
**01.10** Нашы навіны.
**01.25** Навіны спорту.

**[СТБ]**

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Я-вандроўца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Тэленавела».
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** «Next 2». Серыял.
**15.35** «Черкізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** ПРЭМ'ЕРА! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** ПРЭМ'ЕРА! «Черкізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**22.55** «Аўтапанарама».
**23.15** «Брыгада». Серыял.

**[ЛАД]**

**07.00** Добрая раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Камедыйная драма «Анатомія Грэй-4» (ЗША). Заключная серыя.
**11.30** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.10** «Корцік». 3-я, заключная, серыя.
**13.30** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.25** Мультсерыял «Доктар Дог».
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.00** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Медычныя таямніцы.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** «Два нашэсця».
**19.45** Іранічны дэтэктыў «Цень самурая» (Беларусь-Расія). 4-я, заключная, серыя.
**20.50** Калыханка.
**21.10** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**21.45** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**22.40** Крымінальны баявік «Зграя» (Расія). 7-я і 8-я, заключная, серыі.
**00.10** Час футбола.
**00.35** Альбарутенія.

**[РОССИЯ]**

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Геній пароды. Нядоўгае жыццё Віктара Чысцякова» Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**12.25** Алена Якаўлева ў тэлесерыяле «Каменская».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самім галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Тэлесерыял «Вера, Надзея, Любоў».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскія жарсці». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Вера, Надзея, Любоў».
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Алена Якаўлева ў тэлесерыяле «Каменская».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі.ru».
**00.15** «Танга пад Паўднёвым Крыжом».

**[НТВ]**

**07.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.25** Вострасюжэтны серыял «Таксіст».
**09.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.00** Сёння.
**10.25** «І зноў добры дзень!».
**11.10** «Крамлёўскія жонкі».
**12.05** Серыял «Крымінальнае відэа».
**13.00** Сёння.
**13.30** Крымінальны дэтэктыў «Мужы».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** ЯВострасюжэтны серыял «Сталіца граху».
**21.35** Максім Аверын і Дзяніс Ражкоў у дэтэктыўным серыяле «Глушэц».
**23.25** Сёння.
**23.50** Моладзевы серыял «Школа».
**00.20** «Масквічы».

**[EUROSPORT]**

**09.30** Конны спорт. Кубак нацый (Германія).
**10.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Нідэрланды-Англія. Францыя.
**12.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Баньере-дэ-Лушон-По. Францыя. Этап 16.
**13.10, 23.55** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**13.15** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Францыя. Этап 17.
**18.45** Футбол. Таварыскі матч.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Ірландыя.
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**23.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Агляд.
**00.00** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**01.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс.
**02.25** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.

**[БЕЛСАТ tv]**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах.
**07.50** Побач з намі (тэлечасопіс).
**08.05** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**08.15** Прыватная калекцыя.
**08.35** Паляванне на дзівосы.
**08.50** Невядомая Беларусь: «Кіпіць Няміга», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**09.20** Хто ёсць кім: Валерый Леванеўскі.
**09.40** «Апошні сезон», серыял: 6 серыя.
**10.35** «Папялушка», тэлесерыял: 30 серыя.
**11.00** «Ніжэй за лінію Казярога» 1983 г., Аўстралія. 1 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял: 31 серыя.
**17.30** «Рай Олі Гопнудла», маст. фільм, рэж. Дык Бартлет (Dick Bartlett), 1989 г., ЗША.
**19.00** YoLife! (моладзевая праграма).
**19.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.30** «Надзвычай прыгодніцкая падарожжы Цюхці», мультсерыял.
**19.35** Праект «Будучыня».
**20.05** «Белы ветразь над Прыпяццю», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Грунвальд: 1410–2010. Інсцэнізацыя бітвы».
**22.40** «Зграя», серыял: 7 серыя.
**23.30** Аб'ектыў.

## 23 ЛІПЕНЯ, ПЯТНІЦА

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05** Камедыйны дэтэктыў «Участак» (Расія). 4-я серыя.
**10.05** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-2».
**10.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** «Актуальнае інтэрв'ю».
**12.10** Сацыяльная драма «Вераніка не прыйдзе» (Расія).
**14.20** Відэафільм АТН «Храм памяці».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** «Каханне і жыццё мае…». Дакументальны фільм («Беларусьфільм»).
**16.05** Меладраматычны серыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу» (Расія). Заключная серыя.
**16.55** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Жыву з метрасексуалам».
**18.05** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**19.25** «КЕНА».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйны дэтэктыў «Участак» (Расія). 5-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Драматычная камедыя «Бесклапотная» (Вялікабрытанія).
**00.10** «Начная касмічная містэрыя ў палацавым парку Шенбрун». Трансляцыя з Аўстрыі.
**01.55** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Выклік-4». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Чакай мяне». Беларусь.
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальнае кольца». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Джым Кэры фільме «Вечнае ззянне чыстага розуму».
**23.05** Трылер «Адчай».
**01.20** Нашы навіны.
**01.35** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** Тэленавела.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Сакрэтныя гісторыі».
**14.40** «Next 2». Серыял.
**15.35** «Черкізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** СТБ прадстаўляе: «З чаго пачынаецца Радзіма».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Камедыя па пятніцах»: «Гульня ў чатыры рукі». Францыя - Італія, 1980 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**23.40** «Для тых, хто не спіць»: «Здраднік». ЗША, 2008 г.
**01.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

---

**07.00** Добрая раніца.
**08.00** Час футбола.
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** Жансавет.
**10.05** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**11.05** Дакументальны фільм (Францыя).
**12.05** Гаспадар.
**12.30** Жывы гук.
**13.15** Меладраматычны серыял «Пакахай мяне зноў» (Мексіка).
**14.10** Мультсерыял «Доктар Дог» (Францыя).
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.00** Усё аб бяспецы.
**15.30** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Медычныя таямніцы.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Пра мастацтва.
**19.30** Рэпарцёр «Беларускага часу».
**20.15** Калыханка.
**20.35** Дакументальны фільм «Хто забіў Беніта Мусаліні?» (Расія).
**21.25** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі» (Аўстралія).
**22.20** Дэтэктыўны трылер «Вінаваты» (Вялікабрытанія-ЗША-Канада).
**00.20** Альбарутенія.

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2008 г.
**10.10** «Мой срэбны шар. Ніна Сазонава».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**12.25** Алена Якаўлева ў тэлесерыяле «Каменская».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самім галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Тэлесерыял «Вера, Надзея, Любоў».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскія жарсці». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2008 г.
**20.30** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.20** Навіны - Беларусь.
**22.30** Камедыя «Ванька Грозны». 2008 г.

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.25** Вострасюжэтны серыял «Таксіст».
**09.15** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўны герой прадстаўляе…».
**11.10** «Лепшы горад зямлі».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «Крымінальнае відэа».
**13.00** Сёння.
**13.30** Крымінальны дэтэктыў «Мужы».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Крымінальны серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** Вострасюжэтны серыял.
**22.35** «Таблетка ад старасці». Навуковы дэтэктыў Паўла Лабкова.
**23.45** «Масквічы».
**00.30** Трылер «Пах ночы».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Нідэрланды-Англія. Францыя.
**11.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс.
**11.55** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**12.00** Футбол. Таварыскі матч.
**13.15** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Этап 17.
**15.10** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**15.15** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Этап 18.
**18.30** Футбол. Таварыскі матч.
**19.15** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.25** Футбол. Таварыскі матч.
**20.30** Футбол. Таварыскі матч.
**21.00** Футбол. Таварыскі матч.
**23.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Агляд.
**23.50** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**00.00** Боўлінг. PBA тур. ЗША. Часопіс.
**01.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Этап 18.
**02.25** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** «Белы ветразь над Прыпяццю», дак. фільм, рэж. Уладзімір Колас, 2009 г., Беларусь.
**08.40** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**08.50** «Грунвальд: 1410–2010. Інсцэнізацыя бітвы».
**10.10** «Папялушка» (Kopciuszek), тэлесерыял: 31 серыя.
**10.30** YoLife! (маладзевая праграма).
**10.50** «Зграя», сенсацыйны серыял: 7 серыя.
**11.40** «Рай Олі Гопнудла».
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка» (Kopciuszek), тэлесерыял: 32 серыя.
**17.30** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 7 серыя.
**18.15** Форум (ток-шоў): «Нябачная вайна».
**19.00** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**19.25** «Надзвычай прыгодніцкія падарожжы Цюхці», мультсерыял.
**19.35** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.00** МакраФон: фестываль «Be Free–2008»: выступы гуртоў «Хуй» і «IQ48».
**20.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Наўцёкі», маст. фільм, рэж. Роджэр Доналдсан, 1994 г., ЗША.
**23.15** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы.
**23.25** Аб'ектыў.

## 24 ЛІПЕНЯ, СУБОТА

---

**06.50** Дакументальна-пазнавальны серыял «Планета дрэў» (Францыя).
**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.40** Пазнавальны серыял «Чалавек супраць дзікай прыроды». (ЗША-Вялікабрытанія). Фільм «Ісландыя».
**10.30** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё»(Украіна). Фільм «Раскрутка зорак».
**11.10** «Славянскі базар». выбранае.
**12.10** Залатая калекцыя савецкага кінематографа. Камедыя «Спортлато-82» (СССР).
**13.55** Дакументальны фільм «Спортлато-82».Невядомая версія « (Украіна).
**14.45** Відэафільм АТН «Ціхая буржуазія».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.15** Дакументальны цыкл «Фартыфікацыя» (Беларусь).
**16.55** Відэафільм АТН « Магілёўскія відарысы» цыкла «Зямля беларуская».
**17.10** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**17.35** «OFF STAGE LIFE» з Ганнай і Сержем Бандарчук.
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНА».
**19.30** «Бяссонная ноч» . Канцэрт Вітаса.
**21.00** Панарама.
**21.40** Адмысловы рэпартаж АТН «Славянскі кірмаш-2010».
**21.50** Трагікамедыя «Жыццё як цуд» (Сербія-Францыя-Італія).
**00.35** Уласнай персонай.

---

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Мая выдатная няня». 2004 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** Прэм'ера. «Васіль Ліванаў. «У жыцці я не Шэрлак Холмс».
**12.10** Вячаслаў Ціханаў у фільме «Справа была ў Пенькове».
**14.05** «Кітайскі сервіз».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Розыгрыш».
**18.00** «Апошні легіён».
**19.55** «Чакай мяне». Беларусь.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Дыскатэка 80-х».
**22.50** Меладрама «Ледзяная нявеста».
**00.30** С. Сталоне ў фільме «Рэмба-4».

---

**07.20** «Анфас».
**07.35** «Афрамасквіч - 2». Серыял.
**08.25** «Сямейнае кіно»: «Прынц і жабрак». СССР, 1972 г.
**09.40** «Калі ласка, скардзіцеся».
**10.00** «Крокі да поспеху» з Алінай Кабаевай.
**10.55** «Мінск і мінчукі».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.10** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.40** «Залатая калекцыя»: «Каранцін». СССР, 1983 г.
**15.15** «Ваенная таямніца».
**15.45** Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.45** «Кіно»: «Ван Гог не вінаваты». Украіна, 2008 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Сусветны блокбастар»: «Не кажы ні слова». ЗША - Аўстралія, 2001 г.
**22.20** «Зорны рынг».
**23.20** «Нефармат»: «Удачлівы». Расія, 2006 г.
**01.00** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

---

**07.05** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**07.35** Драма «Карміцелька» (Італія).
**09.25** Нашы тэсты.
**10.00** Жансавет.
**10.40** Свая кампанія.
**11.20** «Жарсці па культуры».
**12.00** Прыгодніцкі дэтэктыў «Радзіма чакае» (Расія). 1-я - 6- я, заключная , серыі.
**17.20** «Смешныя людзі». Гумарыстычная праграма (Расія).
**18.25** Меладрама «Час шчасце» (Расія-Украіна).
**20.25** Драма «Каліна чырвоная» (СССР).
**22.20** Веславанне акадэмічнае. Чэмпіянат свету U-23. Фіналы.
**23.55** Жывы гук.

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** Весткі.
**07.10** «Мая вуліца».
**08.25** Мультфільм.
**08.45** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**10.25** «Ранішняя пошта з Ларысай Рыбалёвай».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Камедыя «Ванька Грозны». 2008 г.
**13.45** «Уся Расія».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Пакой смеху».
**14.30** «Алімпійскі спакой. Сакрэты бяспекі». Дакументальны фільм.
**15.25** Фільм «Шосты».
**17.05** «Суботні вечар».
**19.00** Весткі.
**19.25** «Стромкі маршрут Ігара Крутога». Дакументальны фільм.
**20.50** «Гаішнікі». Расія, 2008 г.
**22.55** «Кактус і Алена». 2006 г.
**00.50** «Вяселле ў Малінаўцы».

### НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Агляд».
**09.20** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Жаночы погляд» Аксаны Пушкінай. Вольга Слуцкер.
**14.00** Фантастычныя прыгоды «Легенда».
**16.00** Сёння.
**16.15** «Вочная стаўка».
**17.10** «Злачынства будзе раскрыта».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Самыя гучныя «Рускія сенсацыі».
**21.20** «Ты не паверыш!».
**21.55** Фантастычны баявік «Падшыванец».
**23.55** Вострасюжэтны фільм.

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Таварыскі матч.
**11.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Этап 18.
**12.25** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**12.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Германія. 1/4 фіналу.
**14.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Этап 18.
**15.10** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**15.15** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Этап 19.
**18.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Германія. 1/4 фіналу.
**19.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Германія. 1/4 фіналу.
**21.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Англія-Францыя. Францыя.
**21.45** Конны спорт. Турнір Global Champions Tour. (Францыя).
**23.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Агляд.
**23.55** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**00.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**02.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** Форум (ток-шоў): «Нябачная вайна».
**08.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**08.55** Басанож па свеце.
**09.20** МакраФон: фестываль «Be Free–2008»: выступы гуртоў «Хуй» і «IQ48».
**09.50** «Папялушка» (Kopciuszek), тэлесерыял: 32 серыя.
**10.15** «Надзвычай прыгодніцкія падарожжы Цюхці», мультсерыял.
**10.40** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 7 серыя.
**11.20** «Наўцёкі».
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**17.30** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 8 серыя.
**18.20** Чалавек-эпоха: «Час Чжоў Энылая», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 1998 г., Беларусь.
**19.25** «Надзвычай прыгодніцкія падарожжы Цюхці», мультсерыял.
**19.35** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.00** «Радаводны знак», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**20.20** МакраФон: «Minsk-Mixt–2008»: канцэрт гурта «B:N:».
**20.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.10** «Антон Астаповіч: каб ведалі адкуль наш род!», дак. фільм, рэж. Мікалай Ваўранюк, 2010 г., Польшча.
**21.30** Суботні сеанс: «Узломшчыцы сэрцаў» (Heartbreakers), камедыя, рэж. Дэйвід Мэркін (David Mirkin), 2001 г., ЗША.
**23.25** Аб'ектыў.

## 25 ЛІПЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**08.10** Мультфільмы «Залатая антылопа».
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал». Праграма пра войска.
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.50** Альманах вандраванняў.
**10.20** Кулінарнае шоў (ЗША).
**10.55** «У свеце матораў».
**11.30** «Nota Bene».
**12.10** Залатая калекцыя савецкага кінематографа. Меладрама «Асабістая справа суддзі Івановай» (СССР).
**13.45** VII Нацыянальны фэст беларускіх фільмаў (г.Брэст).
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН «Берлін: прадчуванне Вёсны».
**15.55** Сямейная меладрама «Выпрабаванне Акілы» (ЗША).
**18.05** Суперлато.
**19.00** Дакументальна-гістарычны цыкл «У пошуках ісціны» (Украіна). Фільм «Здань Яна Фёдарава».
**19.35** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна). Фільм «Сяргей Пенкін».
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНА».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.05** Прэм'ера. Драма «Здымкі ў Палерма» (Германія-Францыя-Італія).

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Мая выдатная няня». 2004 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** «Шчасце ёсць!».
**12.00** «Фазэнда».
**12.45** Уладзімір Высоцкі ў фільме «Вертыкаль».
**14.15** «Доўгачаканае каханне».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Свая каляіна». Памяці Ўладзіміра Высоцкага.
**18.00** «Уладзімір Высоцкі і Марына Владзі. Апошні пацалунак».
**19.00** «Дэтэктар хлусні».
**20.00** Контуры.
**21.05** Прэм'ера. Юбілейны вечар Алега Анофрыева.
**23.05** Прэм'ера. «Юленька».

**06.55** «Афрамасквіч - 2». Камедыйны серыял.
**07.45** «Кіно»: «Гульня у чатыры рукі». Францыя - Італія, 1980 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.45** «Дарагая перадача».
**14.00** «Залатая калекцыя»: «Чорны замак Альшанскі». СССР, 1983 г.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «У параднага пад'езда» з Кацярынай Забенько.
**17.20** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** «Фільм тыдня»: «Аднакласнікі». ЗША, 2007 г.
**22.45** «Прафесійны бокс».
**23.40** «Арт-хаўс»: «У год трынаццаці месяцаў». Германія, 1978 г.
**01.50** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.15** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**07.35** Меладрама «Час шчасце» (Расія-Украіна).
**09.20** Нашы тэсты.
**10.00** Школа рамонту.
**11.05** Фільм-казка «Прыгоды Бураціна» («Беларусьфільм»). 1-я і 2-я серыі.
**13.25** «Правы чалавека». Аўтарская праграма Яўгенія Новікава.
**13.40** Лірычная камедыя «Сэрцы чатырох» (СССР).
**15.25** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**16.15** Прыгодніцкі баявік «Танкі бруду не баяцца» (Расія). 1- я - 4-я, заключная, серыі.
**19.45** Смешная часіна.
**20.20** Эксцэнтрычная камедыя «Дзякуй за ўсё» (Італія).
**22.05** Веславанне акадэмічная. Чэмпіянат свету U-23. Фіналы.
**00.30** Свая музыка. Працяг.

**07.00** «ХА». Маленькія камедыі.
**07.20** «Кактус і Алена». 2006 г.
**09.00** «Гаішнікі». Расія, 2008 г.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** «Вяселле ў Малінаўцы».
**14.00** Весткі.
**14.20** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.50** «Сумленны дэтэктыў». Аўтарская праграма Эдуарда Пятрова.
**15.20** «Адзіная».
**17.20** Прэм'ера. «Аншлаг і Кампанія».
**19.00** Весткі.
**19.25** Памяці Уладзіміра Высоцкага. «Французскі сон». Дакументальны фільм.
**20.20** «Злачынны запал». 2009 г.
**22.10** «Дзяўчынка». 2008 г.
**00.40** 1/4 фіналу першай лігі «КВЗ».

**07.30** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Іх норавы».
**08.55** «Дачны адказ».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Лепшы горад зямлі».
**11.10** «І зноў дабрыдзень!».
**12.00** «Месца сустрэчы змяніць нельга».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Месца сустрэчы змяніць нельга».
**19.00** Сёння.
**19.30** Прэм'ера. «Вышыня». Памяці Ўладзіміра Высоцкага.
**20.20** Прэм'ера. « 30 гадоў без Высоцкага».
**21.35** Прэм'ера. «За межамі закона».
**23.25** «Свая каляіна. Высоцкі ў кіно».
**00.30** «Футбольная ноч».
**00.55** «Асабліва небяспечны!».

**09.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Германія. 1/4 фіналу.
**11.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс.
**11.55** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**12.00** Вось дык так!
**12.15** Аўтаспорт. Гонкі ў класе Турынг. Кубак Еўропы. Зальцбург (Аўстрыя). Гонка 1.
**12.45** Аўтаспорт. Суперкубак Паршэ. Хоккенхайм (Германія).
**13.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Этап 19.
**15.00** Вось дык так!
**15.15** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Этап 20.
**19.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Германія. 1/4 фіналу.
**19.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Германія. 1/4 фіналу.
**21.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Германія. 1/4 фіналу.
**22.45** Вось дык так!
**23.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Агляд.
**23.55** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**00.00** Мотаспартовы часопіс.
**00.15** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Германія. 1/4 фіналу.
**01.15** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс.
**02.10** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**02.15** Мотаспартовы часопіс.

**07.00** Аб'ектыў.
**07.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**07.55** «Антон Астаповіч: каб ведалі адкуль наш род!», дак. фільм, рэж. Мікалай Ваўранюк, 2010 г., Польшча.
**08.10** «Радаводны знак», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**08.30** МакраФон: «Minsk-Mixt–2008»: канцэрт гурта «B:N:».
**08.50** Чалавек-эпоха: «Час Чжоў Эньлая», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 1998 г., Беларусь.
**09.55** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**10.20** «Надзвычай прыгодніцкія падарожжы Цюхці», мультсерыял.
**10.35** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**11.20** «Узломшчыцы сэрцаў».
**17.00** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**17.30** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 4 серыя.
**18.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.25** Дакументальная гадзіна: «Легенда Грунвальду» (Legenda Grunwaldu), дак. фільм, рэж. Міраслаў Граноўскі (Mirosław Gronowski), 2010 г., Польшча.
**19.25** «Надзвычай прыгодніцкія падарожжы Цюхці», мультсерыял.
**19.30** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 2, 3 серыя.
**19.20** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Побач з намі (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.50** Фільматэка майстроў: «Танцы з ваўкамі» (Dances with Wolves), маст. фільм, рэж. Кевін Костнэр (Kevin Costner), 1990 г., ЗША. У галоўнай ролі: Кевін Костнэр (Kevin Costner).
**00.15** Тыдзень у «Аб'ектыве»

# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску. Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў праз пошту або праз банк. Нашы рэквізіты: нумар рахунку: 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11

(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______

(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у аддзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)
Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик
Пеня ______
Всего ______
Кассир

Для тых, хто прымае рашэнні!
Новы час
www.novychas.org

ФУТБОЛ

# МУНДЫАЛЬ: ад А да Я

Іван БІЧ

**Журналісты польскай газеты «Sport» склалі ў алфавітным парадку спіс рэчаў і падзей, якімі найбольш запоўніўся еўрапейцам Чэмпіянат свету па футболе ў Паўднёвай Афрыцы. Прапануем некаторыя фрагменты футбольнай азбукі.**



### Афрыка

Галоўнае расчараванне чэмпіянату. Толькі адна каманда з Чорнага кантынента прайшла ў другі тур. Спартовы гонар выратавала Гана. Калі б ганская зборная не прайшла ў чвэрцьфінал, то для афрыканскага футболу гэта была б катастрофа. Цалкам магчыма, што FIFA пераглядзеў бы квоту прадстаўніцтва ад кантынента на наступным чэмпіянаце. А так дзякуючы Гане, якая ледзь не прайшла ў паўфінал, інтрыга наконт рэсурсаў афрыканскага футболу ўсё ж засталася.

### Блатэр Зеп

Гаворка не пра старшыню FIFA, так назвалі сабаку пароды тэр'ер, які ўвесь чэмпіянат лятаў на халяву на лініях мясцовай авіякампаніі «Kulula». Увогуле, лятаць павінен быў не сабака, а чалавек. Такі бонус вырашыла падараваць прэзідэнту FIFA згаданая кампанія ў знак падзякі за тое, што ён дабіўся правядзення турніру ў Паўднёвай Афрыцы. Аднак Зеп адмовіўся. Яго вырашылі замяніць сабакам. Па ходу чэмпіянату сабаку нават стварылі старонку на Facebook (tiny.cc/seppthedog).

### Бяспека

Такой сістэмы бяспекі, як у ПАР, турысты з Еўропы яшчэ не ведалі. У кожным пакоі ў гатэлі была кнопка, якую трэба націскаць у выпадку рабавання. Звычайна пасля надыходу цемры людзі на вуліцы не выходзяць, і наогул, перасоўваюцца толькі на машынах. У гарадах практычна няма крамаў, а ўсе тавары набываліся ў гандлёвых цэнтрах, якія добра ахоўваюцца.

### Вувузела

Відавочна, самая папулярная рэч падчас чэмпіянату. Гул, які выдавалі вувузелы, так дастаў грамадства, што на ўваходзе некаторых рэстаранаў у ПАР з'явіліся надпісы: «Прыносіць зброю і вувузелы забараняецца». Самае цікавае, што мода на гудзенне ў тыя трубы хутка выйшла за межы ПАР. Іх велікімі партыямі імпартавалі ў Еўропу, дзе яны ўжо таксама паспелі шмат каму надакучыць. Напрыклад, дырэкцыя шэрагу стадыёнаў у ФРГ ужо забараніла пранос інструментаў на свае трыбуны. Яшчэ далей пайшлі ўлады Аб'яднаных арабскіх Эміратаў. Увоз у краіну вувезул і іх выкарыстанне лічыцца ў ААЭ адміністратыўным злачынствам.

### Дарогі

Уся краіна злучаная 3–4-палоснымі аўтастрадамі. Аказваецца, у ПАР машыны — гэта нешта накшталт культу. Сям'я можа жыць у бараку з дзіравым дахам, аднак пры гэтым на двары будзе стаяць аўтамабіль апошняй маркі. Мясцовыя жыхары, якія прымалі ў сябе падчас турніру іншаземных турыстаў, часам нават набывалі для іх аўтамабілі.

### Зіма

Чэмпіянат у Паўднёвай Афрыцы быў унікальным таксама з пункту гледжання сезону года. Упершыню Кубак свету адбыўся ва ўмовах зімы. Хаця афрыканская зіма цяплей нашай, аднак часам даводзілася апранаць курткі і шапкі. Больш за ўсё пакутавалі ад холаду варатары.

### Зоркі рэкламы

Напярэдадні Кубка свету шмат кампаній вырашылі прасоўваць сваю прадукцыю за кошт футбалістаў, якія павінны былі яе рэкламаваць. Здаецца, ніколі яшчэ ў гісторыі футбалісты ў такой колькасці не былі запатрабаваныя на рынку рэкламы. Самае парадаксальнае, што на палях ПАР усе зоркі рэкламы поўнасцю праваліліся. Персанажы рэкламных ролікаў і білбордаў не забілі нават ніводнага голу.

### Кейптаун

Адно з галоўных адкрыццяў чэмпіянату для еўрапейцаў. Кейптаун не толькі самы еўрапейскі горад у Паўднёвай Афрыцы, аднак і багаты на культурнае жыццё. Не дзіўна, што 80 працэнтаў жыхароў Кейптауну ўвогуле ніколі ў жыцці не выязджалі з горада.

### Кім Чэн Ір

Правадыр Паўночнай Карэі праявіў сябе і як арыгінальны футбольны стратэг. Любімаму кіраўніку (адно з афіцыйных прозвішчаў Кіма) не спадабалася, што падчас матчу з Бразіліяй каманда сканцэнтравалася на абароне. З П'хеньяну прыйшоў загад — у матчы з партугальцамі ісці напрад. Змена тактыкі мела эфект. Зборная КНДР прайграла 0–7.

### «Kulula»

Папулярныя і самыя танныя ў ПАР авіялініі. Правілы пералёту на «Kulula» папросту шакіравалі турыстаў са Старога свету. Вось адна з абвестак на борце самалёту кампаніі: «Просьба да тых, хто выжыве ў выпадку катастрофы, не скідаць у адну кучу ногі і рукі мёртвых пасажыраў».

### Лінія варотаў

Пасля таго, як англічанін Франк Лэмпард патрапіў у перакладзіну ў матчы Англія — Германія, мяч адскочыў і ўпаў за лінію варот. Чысты гол, аднак суддзя гэтага не заўважыў. Гэта гісторыя выклікала вялікі скандал і прымусіла FIFA заявіць, што ў футболе пачынаецца тэхналагічная рэвалюцыя. У снежні на канферэнцыі асацыяцыі будзе прынята рашэнне аб выкарыстанні кампутарнай тэхнікі падчас судзейства. Аднак пры гэтым футбольная чыноўнік паведаміў, што 96 працэнтаў судовых рашэнняў на чэмпіянаце былі слушныя.

### Марадона Дыега

Суперзорка чэмпіянату, які, праўда, на гэты раз выступіў у іпастасі трэнера. Дыега шмат пазіраваў, паліў сігары на трэніроўках, распавядаў эратычныя анекдоты. Усё яму даравалі да фатальнага матчу аргенцінцаў з немцамі. Цяпер рэпутацыя Дыега пад пагрозай.

### McMundial

FIFA, як вядома, зарабляе на спартовых мерапрыемствах шалёныя грошы. Чэмпіянат у ПАР не быў выключэннем. Найбольш гэта праявілася ў сферы харчавання. Манапольнае права гандляваць прадуктамі ў раёне стадыёнаў было прададзенае кампаніі McDonald's. Прычым плаціць можна было наяўнымі грашыма або карткамі Visa.

### Нігерыйцы

Нігерыйцы для жыхароў заможных гарадоў ПАР — нешта накшталт каўказцаў для масквічоў. На іх, а таксама на эмігрантаў з Зімбабве, вешаюць адказнасць за большасць паўсядзённых злачынстваў. Нігерыйская мафія сапраўды трымае гандаль наркотыкамі, прычым гандлюе вельмі арыгінальна: нігерыйцы ловяць мінака і прапануюць набыць дозу. Калі не набудзеш — забяруць грошы.

### Французская ганьба

Яшчэ напярэдадні Кубка свету прэса пісала, што Францыя не мае маральнага права гуляць на чэмпіянаце, паколькі прайшла ў склад яго ўдзельнікаў выключна за кошт гола, які Анры Т'еры забіў рукой. І СМІ мелі рацыю. Такой ганьбы, як у Паўднёвай Афрыцы, зборная яшчэ не бачыла. Акрамя паразы на полі, каманда перасварылася з трэнерам. Той, у сваю чаргу, спачатку прабаваў падавіць бунт за кошт таго, што выганяў са зборнай гульцоў. Усё гэта назіралі 65 мільёнаў французаў. У выніку канфлікт паміж трэнерам і спартсменамі быў вымушаны вырашаць сам прэзідэнт Нікаля Сарказі.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Эксперты таксама згодныя з тым, што за 16 гадоў свайго праўлення Лукашэнка рэанімаваў і мадэрнізаваў савецкую адміністрацыйную вертыкаль. Але што мы ў выніку атрымалі? Мы атрымалі мабілізацыйна-размеркавальную мадэль у эканоміцы, тое, што ў нас завецца «беларускай эканамічнай мадэллю». Яна па-свойму эфектыўная, але толькі тады, калі краіна перажывае «глыбокі эканамічны крызіс». Не ў апошнюю чаргу менавіта такая мабілізацыйна-размеркавальная мадэль эканомікі патрабавала цвёрдага, часам ручнога кіравання. І вось мы маем цвёрдую прэзідэнцкую вертыкаль з яе гаспадаром, які працэдурна забяспечыў сабе пры жаданні пажыццёвае кіраванне.

**«Deutche Welle» (Германія)**

Іншага выйсця, як ісці ў Мытны Саюз, у Бацькі не было. Беларускае грамадства вельмі насцярожана ставіцца да ўсяго, што мае дачыненне да партнёрства з Расіяй. Перш за ўсё, таму што гэта кааперацыя прыносіць рэальны прыбытак у выглядзе гандлёвых прэферэнцый і наўпроставых інвестыцый у эканоміку. Лукашэнка заўсёды набіраў іміджавыя балы як інтэгратар. Так што яго дэманстратыўны няўдзел у Мытным саюзе мог бы выліцца ў страту рэйтынгу напярэдадні выбараў. Вось і давялося Аляксандру Рыгоравічу выціскаць з сябе ў Астане: «Беларусь сыходзіць з таго, што любы саюз братэрскіх, блізкіх дзяржаў павінен быць ім на карысць».

**«Итоги» (Расія)**

Здрэшты, паверыць у тое, што Масква змажа прымусіць Лукашэнку сысці, у цяперашніх умовах усё ж вельмі праблематычна. Больш верагодна з'яўляецца версія, паводле якой Масква вырашыла папросту адпомсціць беларускаму лідэру за непрыстойныя паводзіны, пры гэтым не маючы намераў адхіліць яго ад улады. Прычым пад Масквой у дадзеным выпадку варта мець на ўвазе ў першую чаргу пазіцыю Пуціна. Мядзведзеву Лукашэнка, вядома, таксама добра насаліў, але з пункту гледжання Пуціна ён увогуле зрабіў замах на самае святое. Для расійскага прэм'ера ініцыяваны ім Мытны саюз — нешта значна большае, чым проста эканамічны праект. Гэты рэальны рух у бок аднаўлення Савецкага Саюза, распад якога Пуцін калісьці назваў самай буйной геапалітычнай катастрофай XX стагоддзя. І чалавек, які ўстаўляе палкі ў колы гэтага лёсавызначальнага праекта, безумоўна, заслугоўвае самага суровага пакарання.

**«Коммерсант» (Расія)**

Паводле ацэнак Нацыянальнага банка, для забеспячэння фінансавай стабільнасці Беларусі неабходна прыцягнуць пазыкі і інвестыцыі на 10 мільярдаў долараў. Пры гэтым на дапамогу Масквы беларусам разлічваць складана. Мінску даводзіцца самому вырашаць эканамічныя праблемы. Адна з іх — дэфіцыт бюджэту. За студзень-май ён склаў 2,4 працэнта ВУП. Але са студзеня па май запазычанасць па падатках вырасла ў 1,7 разы. Беларуская адміністрацыйная машына, падобна, катэгарычна накіравана вырашаць праблемы. У барацьбе за бюджэт цяпер удзельнічаюць службоўцы ўсіх узроўняў, ад міністраў да старшыняў райвыканкамаў. Яны ведаюць тысячу спосабаў адносна сумленнага адабрання грошай у насельніцтва і не грэбуюць браць з людзей дробязь.

**«Рускі Newsweek» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ



### КАЛУМБІЯ. ІНГРЫД БЕТАНКУР ПАТРАБУЕ ГРОШАЙ

Інгрыд Бетанкур, якая мае калумбійскі і французскі пашпарты, былая заложніца партызан з групоўкі «Рэвалюцыйныя ўзброеныя сілы Калумбіі» (FARC), нечакана запатрабавала ад уладаў Калумбіі грашовую кампенсацыю. Па яе словах, дзяржава нясе прамую адказнасць за тое, што яна 6 гадоў (2002–2008) была ў партызанскім палоне. Свае пакуты Інгрыд ацаніла ў 6,3 мільёна еўра. Дэмарш Бетанкур, якая балатавалася на прэзідэнцкіх выбарах 2002 года ад Партыі зялёных, выклікаў неадназначную рэакцыю. Сума, якую патрабуе Бетанкур для краіны, дзе сярэдні заробак складае 200 долараў на месяц, папросту велізарная. Тым больш, што Інгрыд выратавалі з палону менавіта калумбійскія спецслужбы. Аднак, па яе словах, гэта не кампенсуе шасці гадоў жыцця і страчанага здароўя (у палоне Інгрыд гвалцілі, трымалі на ланцугу і г.д.). Акрамя таго, выплата кампенсацыі, як лічыць Інгрыд, магла б стаць праваўым прэцэдэнтам, пасля якога ўлады будуць больш эфектыўна вызваляць заложнікаў FARC. Цікавы каментар з нагоды заяў Бетанкур даў Густаў Перо, лідэр вядучай левай партыі, якая нефармальна звязаная з партызанамі. Па яго словах, Інгрыд павінна дзякаваць байцам FARC за тое, што яны выратавалі яе ад калумбійскіх спецназаўцаў, якія звычайна забіваюць усіх, каго сустракаюць у партызанскіх зонах. Тое, што яе не забілі падчас аперацыі па выратаванню ў 2008 годзе, папросту цуд.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

### УКРАІНА. КАХАНКА АДПРАВІЛІ Ў АДСТАЎКУ



У кабінеце Мікалая Азарава першая гучная адстаўка. Партфеля міністра надзвычайных сітуацый пазбавілі Нестара Шуфрыча, якога ў свой час лічылі тайным каханкам Юліі Цімашэнкі. Аднак наўрад ці інтымныя сувязі з Лэдзі Ю, калі яны сапраўды мелі месца, сталі прычынай звальнення. На думку палітолагаў, зараз у Партыі рэгіёнаў, якая фармуе ўрад, назіраецца вайна паміж групоўкамі. Галоўны падзел праходзіць па пытанню, ці трэба мяняць канстытуцыю. Партыя рэгіёнаў зараз паслядоўна перакупае дэпутатаў БЮТ у Вярхоўнай радзе і, магчыма, хутка будзе мець неабходную колькасць мандатаў, каб змяніць канстытуцыю. Некаторыя ў выніку канстытуцыйнай рэформы хацелі б пашырыць правы прэзідэнта. Аднак ёсць апазіцыя. Калі ў краіне будзе прэзідэнцкая рэспубліка, патрэба падтрымліваць парламентарыяў, якія прадстаўляюць у Вярхоўнай радзе шматлікія бізнес-групоўкі, адпадзе. Ахвярай гэтай вайны і стаў Шуфрыч, які выступае супраць канстытуцыйнай рэформы. Прысутнічае тут і асабісты фактар. Прынамсі сам Шуфрыч кажа пра тое, што яго звольнілі з-за канфлікту з Сяргеем Лёвачкіным (кіраўнік прэзідэнцкай адміністрацыі). Зрэшты, а чаго Нестар хацеў? Год таму Шуфрыч пры людзях ударыў Лёвачкіна па твары.

**Па матэрыялах украінкай прэсы**



### ІСПАНІЯ. ФУТБОЛ ВЫРАТАВАЎ АД РАЗВАЛУ

Чэмпіянат у Паўднёвай Афрыцы прынёс Іспаніі не толькі першы ў гісторыі тытул чэмпіёна свету, аднак, магчыма, і гарантыі захавання дзяржаўнага адзінства. Як вядома, ужо падчас турніру ў Каталоніі вельмі абвастрылася палітычная сітуацыя. Рашэнне іспанскага канстытуцыйнага трыбуналу выкрасліць з тэксту Статуту аб аўтаноміі некаторыя пункты выклікала пратэсты мясцовага палітыкуму. У Барселоне адбылася мільённая дэманстрацыя пад лозунгамі незалежнасці краю ад Мадрыда. Алею ў агонь падліў той факт, што большасць футбалістаў нацыянальнай зборнай — каталонцы. Гэта ўпарта ігнаравалі іспанскія спартовыя каментатары. Аднак дзякуючы гістарычнай перамозе цяпер у адносінах цэнтра і перыферыі наступіў поўны консенсус. Як піша прэса, футбол аб'яднаў краіну. Лепшы прыклад таму — панарама Барселоны. Упершыню за час чэмпіянату мясцовыя жыхары пачалі публічна вывешваць на дамы і балконы іспанскія нацыянальныя сцягі. Раней гэта лічылася праявай кепскага густу.

**Па матэрыялах «Berliner zeitung» (Германія)**

З НАГОДЫ

# ЧЫРВОНЫ ГРУНВАЛЬД

*Алег НОВІКАЎ*

**Ці мела б сёння святкаванне 600-й гадавіны Грунвальдскай бітвы такі буйны маштаб, калі б у свой час камуністы не зрабілі з падзеі сапраўдны культ?**



Прычына, з якой 15 ліпеня — менавіта ў гэты дзень у 1410 годзе адбылася бітва палякаў і літвінаў з крыжакамі, — аказалася чырвонай датай у афіцыйным календары Польскай народнай рэспублікі, цалкам зразумелая. На які яшчэ гістарычны міф мог абапірацца рэжым, які быў сатэлітам Масквы? Майская канстытуцыя, паўстанні, рэвалюцыя 1905 года, цуд пад Варшавай — усе іншыя гучныя даты польскай гісторыі так ці інакш мелі выразны антыімперскі і антырасійскі падтэкст.

Бітва ж пад Грунвальдам стаіць асобна. Больш таго, негатыўнае стаўленне да крыжацкай экспансія характэрна для палітычнай традыцыі як расіян, так і палякаў. Да таго ж, антынямецкі накірунак меў салідную ідэйную падтрымку ў польскай палітычнай думцы. Лідэр мясцовых нацыяналістаў Раман Дмоўскі яшчэ ў якасці дэпутата расійскай Дзяржаўнай думы даказваў, што пруская мадэль нацыянальнай і культурнай асіміляцыі палякаў з'яўляецца больш эфектыўнай і небяспечнай для польскай нацыі, чым яе расійскі аналаг.

Акрамя таго, крыжацкай тэме добра пасавала істэрыка ў СМІ з нагоды вяртання ў 1945 годзе ў склад Польшчы тэрыторый, якія ў свой час у выніку так званага Націску на Усход (Drang nach Osten) сталі часткай Прусіі. Навязваўся тэзіс пра тое, што Польшча змагла вярнуць сабе Памор'е, Вроцлаў, Шчэцін выключна дзякуючы дапамозе Маскве. Як дадатковы доказ узгадвалі прысутнасць на грунвальдскім полі двух смаленскіх палкоў. Чым вам не гістарычнае вайсковае братэрства двух народаў?

Увогуле, Грунвальд пачалі эксплуатаваць яшчэ ў час першых крокаў па стварэнню прасавецкай Польскай народнай арміі ў 1943 годзе. Адной з самых высокіх узнагарод Арміі стаў Ордэн крыжу Грунвальда.

Застаецца ўзгадаць, што якой бы моцнай ні была інтэрнацыяналісцкая і прамаскоўская рыторыка лідэраў ПНР, заўсёды ў кіруючай Польскай аб'яднанай рабочай партыі існавалі групы нацыяналістаў. Апошнія не лічылі, што заходні дэмакратычны лад аптымальны для Польшчы. Галоўны канцэпт «нацыяналістаў» быў сфармуляваны наступным чынам: ідэалогія працоўнага класа ёсць ідэалогія ўсёй польскай нацыі. Самая вядомая з такога кшталту груповак называлася «партызаны». Яна прыклала руку да антысеміцкай кампаніі ў сакавіку 1968 года.

У выніку Грунвальд быў у ПНР не толькі легалізаваны, аднак стаў самай любімай гістарычнай тэмай афіцыйнай прапаганды. Святкаваць бітву пачалі адразу пасля вызвалення ад фашыстаў. Тым больш, што ў 1945 годзе споўнілася 535 гадоў славутай падзеі. Дата не вельмі круглая, аднак абыйсці яе камуністы не маглі. 15 ліпеня на поле пад Грунвальдам асабіста прыбыў тагачасны кіраўнік ураду Баляслаў Берут. Улады нават дазволілі касцёлу правесці імшу.

З тых часоў шуміха вакол Грунвальда ніколі не прыпынялася аж да падзення рэжыму ў 1989-м. У гэтым ім доўгі час ускосна дапамагалі ўлады ФРГ, якія да пачатку 1970-х гадоў упарта адмаўляліся прызнаваць новыя заходнія межы Германіі, падліваючы тым самым вады на млын камуністычнай агітацыі.

Кульмінацыяй шанавання Грунвальда стаў 1960 год, калі бітве споўнілася 550 гадоў. Праграму ўрачыстасцяў склалі за тры гады да юбілею. Лейтматывам мусіла быць ідэя пра гістарычнае адзінства народаў Усходняй Еўропы, якія на той час уваходзілі ў камуністычны блок. Таксама падкрэслівалі, што новы Drang nach Osten немагчымы дзякуючы стварэнню Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі — першай у гісторыі дзяржавы нямецкіх рабочых і сялян.

У 1959 годзе ўзнікла ідэя пабудаваць на месцы бітвы вялікі манумент (першы помнік стаяў тут з 1910 года). На працоўную вахту сабраліся 30 тысяч маладых чалавек з усёй краіны. У ліпені 1960 года ў прысутнасці Уладзіслава Гамулкі (першы сакратар Польскай аб'яднанай рабочай партыі) пачаліся ўрачыстасці. І цэнтральнай падзеяй стала адкрыццё помніка, які стаяў на фундаменце з фрагментаў зямлі са ста польскіх гарадоў і месцаў, дзе ў сярэднявеччы адбываліся вайсковыя сутычкі з тэўтонцамі. На цырымоніі, паводле афіцыйных дадзеных, прысутнічала 200 тысяч чалавек. Закончылася ўсё салютам і спяваннем… інтэрнацыяналу.

1 верасня таго ж года ў кінатэатрах Польшчы паказалі фільм «Крыжакі». На здымкі стужкі пайшло 33 мільёны злотых. Крытыкі паставілі фільму сярэднюю адзнаку. Аднак глядач вырашыў інакш. Да 1973 года, пакуль «Крыжакі» былі ў пракаце, карціну пабачылі 26 мільёнаў чалавек. Такая салідная лічба кажа пра тое, што тэма Грунвальда і гульня на патрыятычных лозунгах сапраўды мелі рэзананс у масах.

Цікава, што СССР і Чэхаславакія паставіліся да апісанага юбілею вельмі асцярожна. На мерапрыемствы з Масквы і Прагі прыбылі чыноўнікі другога рангу. На думку гісторыкаў, гэта адлюстроўвала стаўленне Хрушчова да Гамулкі, якога ён лічыў польскім нацыяналістам.

У 1975 годзе на банкноце наміналам 50 злотых з'явілася выява славутай карціны Яна Матэйкі «Грунвальдская бітва». Аднак на гэты час тэма Грунвальда была на другім плане. Пасля візіту ў Варшаву Вілі Брандта і прызнання нямецкім бокам вынікаў Патсдамскай мірнай канферэнцыі антынямецкай прапаганды стала значна менш. Гэта адлюстравалася і на статыстыцы публікацый на тэму бітвы.

Затое пра Грунвальд нечакана ўзгадалі ў час вайсковага становішча. У 1981 годзе са згоды Ярузельскага ўзнікае Патрыятычнае аб'яднанне «Грунвальд». Сябры арганізацыі ў сваіх выступах і артыкулах часта згадвалі 1410 год. Па іх словах, палякі ў тыя цяжкія часы перамаглі толькі таму, што аб'ядналіся вакол моцнага лідэра — караля Ягайлы, ахвяраваўшы сваімі правамі і свабодамі.

Дзейнасць «Грунвальда» стала апошнім акордам у гісторыі выкарыстання бітвы ў мэтах камуністычнай прапаганды. Хутка пачаліся палітычныя змены, якія прынеслі з сабой у тым ліку свабодныя дэбаты, меркаванні розных палітычных школ. Стала зразумелым, што Drang nach Osten быў больш складанай гістарычнай з'явай. Прынамсі, яе наступствам стала ўрбанізацыя Польшчы, уключэнне яе ў арбіту еўрапейскай палітыкі. Паралельна вялікую ўвагу новыя дэмакратычныя ўлады надалі забароненым у часы ПНР тэмам — варшаўскаму паўстанню, Арміі Краёвай, Катыні.

Аднак Грунвальд працягвае заставацца самым любімым гістарычным святам у Польшчы, хаця ніякай палітычнай нагрузкі, і перш за ўсё камуністычнай, свята цяпер не нясе.

ЦІКАВА

# VIVE LA ПАРАСЯ!

**На працягу стагоддзяў сімвалам французскай нацыі быў певень. На думку сучасных нацыяналістаў, сёння сімвалам краіны павінна стаць свіння.**




18 чэрвеня ў цэнтры Парыжа сабралася прыкладна 600–700 чалавек. Усе яны дружна елі традыцыйную французскую страву — суп са свініны (soupe au cochon) і ахвотна прапаноўвалі мінакам далучыцца да трапезы. Дэгустацыя супу мела, па словах арганізатараў пікніку, надзвычайны палітычны падтэкст. Свіння, а дакладней, стравы са свініны, на думку правых радыкалаў (яны арганізавалі акцыю), — бастыён французскай ідэнтычнасці ў барацьбе супраць пагрозы культурнай асіміляцыі з боку мусульман. Як вядома, у ісламе і ў іудаізме вернікам забаронена ўжываць свініну.

Незвычайная ініцыятыва публічна есці свініну ў палітычных мэтах нарадзілася яшчэ год таму. Каля парыжскага Усходняга вакзалу адкрылася закусачная, у якой усе стравы гатаваліся са свініны. Гэта было вельмі правакацыйным, паколькі Усходні вакзал знаходзіцца па суседству з арабскім кварталам. Яго жыхары хутка звярнуліся ў гарадскі суд са скаргай, і свіное бістро зачынілі па прычыне дыскрымінацыйнага характару (пазней гэты вердыкт падтрымаў Еўрапейскі суд па правах чалавека ў Страсбургу).

Аднак, як бачым, судовыя забароны свінячыя пратэсты не прыпынілі. Больш таго, апошнім часам спектр кулінарных метадаў абароны нацыянальнай ідэнтычнасці пашырыўся. Тыя, хто жадаюць захаваць нацыянальныя каштоўнасці, не толькі ядуць як мага больш свініны, аднак пры кожнай магчымасці напіваюцца (як вядома, алкаголь таксама забаронены ў ісламе).

Праз сацыяльныя сеткі правыя радыкалы заклікаюць ахвочых выпіць у кампаніі ў гонар нацыі. Гэта называюць Oporto Facebbok. Аматараў падобных вечарынак хапае. Рэкорд быў пастаўлены ўвесну ў Марселі, дзе выпіць прыйшло больш за дзве тысячы чалавек. Такія застольныя пасядзелкі часта заканчваюцца вельмі кепска: у Нанце нехта не надта цвярозы ўмудрыўся ўпасці з мосту і памерці. У другі раз у тым жа Нанце нацыяналісты, дапіўшыся да адпаведнай кандыцыі, папросту пачалі біць адзін аднаму твары. У выніку пяць чалавек трапілі ў шпіталь. Аднак такія пабочныя эфекты патрыётаў не спыняюць.

За ўсімі гэтымі, на першы погляд, смешнымі перформансамі стаяць сур'ёзныя рэчы. Палітолагі кажуць пра ідэйную мадэрнізацыю партый правага спектру, пра з'яўленне ў краіне арганізаванага руху за свецкі характар дзяржаўнага ладу, за якім часта хаваецца банальны расізм.

Апісаную акцыю ў цэнтры Парыжа правяла кааліцыя «Блок за ідэнтычнасць», якая аб'ядноўвае прыкладна два дзесятка палітычных і інфармацыйных праектаў радыкальнага правага кшталту. Блок абараняе тэзіс пра тое, што піць і есці трэба выключна сваё. Спажыванне страў нацыянальнай кухні, як лічаць тэарэтыкі арганізацыі, таксама з'яўляецца добрым сродкам для палітычнага пратэсту.

Калі прасачыць за біяграфіяй лідэраў «Блоку за ідэнтычнасць», аказваецца, што ўсе яны выйшлі з групоўкі Радыкальны саюз (правая экстрэмісцкая арганізацыя, сябра якой у ліпні 2004 года спрабаваў застрэліць Жака Шырака). Сёння пра былыя антысеміцкія забабоны актывісты блоку намагаюцца не згадваць. У канфлікце на Блізкім Усходзе яны, наадварот, сімпатызуюць Ізраілю. Няма ў іх больш і заклікаў супраць рэспубліканскага ладу, які, як яны лічылі раней, не здольны супрацьстаяць паступовай ісламізацыі. Наадварот, яны нагамі і рукамі за кансервацыю спадчыны Вялікай французскай рэвалюцыі. Перш за ўсё, яны жадаюць захаваць свецкасць дзяржавы.

Парадаксальна, аднак за антыісламскімі акцыямі стаяць таксама і левыя актывісты, якім яшчэ Карл Маркс загадаў быць інтэрнацыяналістамі. Як лічаць лідэры груповак, якія таксама заклікаюць спажываць алкаголь і есці свіныя сасіскі, на гэтым этапе барацьбы за сацыялізм, першапачатковая задача — адстаяць свецкі характар дзяржаўнага ладу. Галоўным пастаўшчыком кадраў з лагеру левых у рух аматараў свініны з'яўляюцца трацкісцкія секты.

Змагацца за свецкасць таксама імкнецца вядучая правая партыя Нацыянальны фронт. Праўда, не ўся, а выключна група вакол Марыны Ле Пэн. Марына, якая, як прагназуюць, зменіць бацьку ў крэсле старшыні, заўзята змагаецца за свецкасць. У гэтым плане яе галоўны праціўнік Бруна Гальніш — другі кандыдат на пасаду лідэра партыі — больш схільны да таго, каб партыя і далей трымалася правай традыцыі, якая будуецца на антысемітызме, антыкамунізме і кансерватыўным каталіцызме. Вайна паміж Марынай і Бруна вельмі вострая. Нядаўнюю спробу Бруна надрукаваць у ліёнскай партыйнай газеце вытрымкі з Пратаколаў сіёнскіх мудрацоў Марына назвала «жахлівай». Зразумела, што Марына намагаецца стварыць партыі новы імідж, які б пашырыў кола яе выбаршчыкаў, перш за ўсё сярод далёкай ад рэлігіі моладзі.

Ці здолее Нацыянальны фронт скінуць з сябе путы мінулага? Па сутнасці, гэта другая спроба ідэйнага абнаўлення. Першую спрабавалі правесці ў 1970-я гады правыя інтэлектуалы з гуртка «Новыя правыя». Яны прапанавалі забыць пра рэжым Вішы, старыя-добрыя часы манархіі і страту калоній і разглядаць перспектыву правага руху у рамках агульнаеўрапейскага праекту. Аднак у выніку перамаглі артадоксы і клерыкалы.

Парасячыя пратэсты, між тым, у краіне працягваюцца. У партыйным календары Нацыянальнага фронту на лета амаль штотыдзень плануецца калектыўнае паяданне свініны і распіванне віна ў розных гарадах Францыі. Чым гэта закончыцца, пакуль цяжка прагназаваць, аднак некаторыя асацыяцыі прыназіранні за гэтай кампаніяй узнікаюць. Рэвалюцыі 1848 года папярэднічалі так званыя банкетныя пратэсты, калі рэспубліканцы праводзілі свае сходы за накрытым сталом і агітавалі за рэспубліканскі лад у фармаце тостаў.

Па якому прынцыпу дзяліць Украіну на новыя адміністратыўныя адзінкі? Межы гістарычных тэрыторый не адпавядаюць межам сучасных абласцей. Сыходзячы з гістарычнай логікі, некаторыя вобласці трэба аб'ядноўваць

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### КЕЙКА ФУХІМОРЫ



Дачка Альберта Фухіморы — былога прэзідэнта Перу, які зараз сядзіць за кратамі, нечакана для ўсіх стала лідэрам прэзідэнцкай кампаніі. Пры гэтым праграма яе партыі «Fuerza 2011» вельмі туманная. Натуральна, галоўная стаўка робіцца на настальгію па часах праўлення яе бацькі. Альберта Фухіморы, сапраўды, мае супярэчлівы імідж у грамадстве. З аднаго боку, ён здолеў знішчыць рух левых тэрарыстаў «Sendero Luminoso», навёў у краіне парадак і прыцягнуў інвестыцыі. З другога — не вельмі цырымоніўся з правамі чалавека і законам: даваў хабары і стварыў нават тайную вайсковую службу. У выніку гэта каштавала яму 25 гадоў зняволення. 35-гадовая Кейка ўпэўненая, што большасць суайчыннікаў бачаць у курсе Альберта пераважна пазітыў. Трэба прызнаць, што Кейка Фухіморы мае рацыю. За 10 месяцаў да выбараў яе рэйтынг складае 22 працэнты. Толькі за апошні месяц ён вырас на 4 пункты.

### ГЕНАДЗЬ ЗЮГАНАЎ



Лідэр Камуністычнай партыі Расійскай Федэрацыі (КПРФ) раскрыў цэлую сетку шпіёнаў-неатрацкістаў, якія нейкім чынам пракраліся ў партыйныя структуры. Па словах кіраўніка Цэнтральнай рэвізійнай камісіі Уладзіміра Нікіціна, агенты спрабавалі перашкодзіць партыі сумясціць нацыянальна-вызвольную барацьбу і сацыяльна-класавую актыўнасць — галоўныя кіты, на якіх трымаецца КПРФ. Між тым, па словах спецыялістаў, ніякіх неатрацкістаў няма. Ёсць незадаволеныя курсам Зюганава. Напрыклад, маскоўская арганізацыя, пазіцыі якой падтрымлівае аўтарытэтны сярод камуністаў былы сябра ЦК КПС Ягор Лігачоў. Раней маскоўскае бюро арганізацыі было распушчана, а сталічныя камуністы абвінавачаныя ў ігнараванні партыйных рашэнняў. Відавочна, што ў дадатак на незадаволеных вырашылі павесіць ярлык неатрацкістаў. А каб перастрахавацца на будучыню, той жа самы Нікіцін паведаміў, што пры партыі ствараецца нешта накшталт ведамства ўнутранай і знешняй разведкі. Застаецца дадаць, што згаданы Лігачоў таксама абвінавачаны ў захапленні ідэямі Троцкага, што само па сабе выглядае папросту вар'яцтвам. У часы перабудовы Лігачоў быў хадзячым сімвалам савецкага кансерватызму, адэпты якога ідэі Льва Давыдавіча на дух не пераносяць.

### ІВЕТА РАДЗІЧОВА

Прызначэнне на пасаду кіраўніка славацкага ўраду Іветы Радзічовай выклікала вялікую дыскусію на старонках сусветнай прэсы адносна ролі жанчын у палітыцы. Сталася так, што Івета — трэцяя жанчына, якая за апошнія пару тыдняў стала дзяржаўным лідэрам. Прыблізна ў той жа час пасаду прэм'ер-міністра Аўстраліі заняла Джулія Гілард, а ў Фінляндыі — Мары Ківініемі. Палітолагі гадаюць, ці з'яўляецца мода на жанчын-палітыкаў адным з наступстваў эканамічнага крызісу. Як кажуць некаторыя з іх, крызіс даў жанчынам пропуск у вышэйшы палітычны дывізіён. Доўгі час яны былі маргіналамі. Аднак, калі пачалася рэцэсія, стары палітычны істэблішмент аказаўся скампраметаваны. Грамадства запатрабавала новага, і ў такой атмасферы жанчынам было вельмі зручна рабіць кар'еру. Сваю ролю таксама адыгрывае жаночы характар, які не такі агрэсіўны, як у мужчынаў-палітыкаў. Добры прыклад — Івета Радзічова. Увогуле, прэм'ерам павінен быў стаць іншы чалавек, аднак ён не здолеў дамовіцца з усімі партыямі. А Івета дамовілася. Якія будуць наступствы жаночай хвалі ў палітыцы, казаць цяжка. Не трэба забываць, што навізна не заменіць выбаршчыкам рэальных вынікаў. Лепшы прыклад таму — Ісландыя, якой больш за год кіруюць сацыял-дэмакраты на чале з Йаханай Сігурдардоцір. За год яе ўрад страціў падтрымку. На апошніх выбарах мэра людзі ахвотней галасавалі нават за партыю сатырыкаў, чым за эсдэкаў.



ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# РЫБНЫ ДЗЕНЬ МАЛАДОЙ ЛІТАРАТУРЫ



Vobla — злева направа: Анка Упала, Павел Анціпаў, Юлія Цімафеева, Уладзь Лянкевіч, выдавец Міхась Башура, ногі запрошанага майстра Альгерда Бахарэвіча

Алесь ГІНЗБУРГ

**12 ліпеня самае нефармальнае літаб'яднанне Мінска — «Вобла» — абвясціла пра адкрыццё новага сезону. З гэтага тыдня аўтары, аб'яднаныя вакол выдавецтва «Галіяфы» (і не толькі яны), збіраюцца на літаратурныя чытанні і абмен досведам па панядзелках з 6-й да 10-й вечара ў краме-галерэі «Падземка» (праспект Незалежнасці, 43).**



Запрошаны майстар Альгерд Бахарэвіч

Творчая суполка з такой спецыфічнай назвай з'явіліся больш за год таму пасля даволі розгаласнай гісторыі горадаўпарадкавання, калі паўстала пагроза закрыцця ў цэнтры сталіцы, на вуліцы Карла Маркса, крамы «Рыба». Гандлёвае прадпрыемства старой закалкі са спецыфічным пахам рыбы і піва было мілае не аднаму пакаленню беларускай савецкай багемы. На факультэце філасофіі БДУ, з інтэрнатам якога крама суседзіць, яна калісьці славілася тым, што адчынялася а 8-й, і можна было яшчэ да заняткаў туды завітаць. Апроч таго, мастакі адзначаюць унікальныя керамічныя барэльефы, якія ўпрыгожваюць інтэр'ер установы. На абарону «Рыбы» тады ўзняліся мастакі ды паэты. Выйшаў альманах «Тэксты», прысвечаны акіянічнай тэматыцы.

І вось «Вобла» працягвае плаванне. «Нас пацешыла гасціннасць крамы «Падземка», — расказвае адзін з лідэраў аб'яднання Зміцер Вішнёў, запарваючы гарбату ў кубак. Прыемна, што пасля адкрыцця галерэі «Ў» творчае жыццё адсюль не схлынула. Да таго ж, мы ўжо маем дамоўленасць: у «Падземцы» будуць па-ранейшаму прадавацца беларускія кніжкі».

А пакуль што на ўтульных насыпных крэслах размясціліся тыя, хто іх піша. Або збіраецца пісаць. Або, прынамсі, перакладае. Перакладчык Ігар Жалткоў, таксама натхняльнік «Воблы», расказвае: «Фармальна пасяджэнні нашага аб'яднання — гэта майстар-класы: мы запрашаем прызнанага пісьменніка на чытанні. У другой частцы права выказвацца атрымлівае моладзь. Завязваецца нязмушаны дыялог. Да ўдзелу запрашаюцца ўсе ахвочыя, дастаткова смелыя, каб агучыць публічна свае тэксты».

## Літаб'яднанні Мінска

**«Вобла»** — усё робіць супраць плыні . Вось і адкрыццё сезону — у час адпачынкаў. Але ж рыхтуемся да восені — пары ведаў і заняткаў. Назавем яшчэ дзве цікавыя творчыя пляцоўкі ў Мінску, дзе перыядычна ладзяцца абмеркаванні маладой літаратуры.

**«ЛІТО.Беларусь»:** Кіраўнікі — Георгі Барташ, Віка Трэнас. Месца сустрэчы — майстэрня мастака Дзяніса Кандрацьева, праспект Незалежнасці, 45. Дні сустрэч вызначаюцца стыхійна. Абвесткі можна пабачыць на сайце http://lito.ru/club/by. Фармат сустрэч — выступ запрошанага госця: беларускага або расійскага творцы. Аднак канцэрт мэтра наступае толькі пасля таго, як прысутныя літаратары агучаць свае новыя творы і пачуюць крытыку ад старэйшага калегі.

**«Літаратурнае прадмесце»:** Кіраўнік — Людміла Рублеўская. Дні сустрэч — чацвяргі, а 18:30. Месца сустрэчы — апошнім часам сустракаліся ў Купалаўскім музеі. Фармат сустрэч: некалькі чалавек чытаюць свае вершы, а некалькі іх разбіраюць. На наступным тыдні крытыкі абавязаныя выставіць на чужы суд ужо свае творы. Суполка шумная, вясёлая, любіць ладзіць унутраныя святы, конкурсы, літаратурныя гульні.

ЦІКАВА

# ФОТАВІЛЬНЯ

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**Звычайная чорна-белая фатаграфія віленскай катэдры. Але маю ўвагу прыцягваюць нейкія драўляныя вышкі на ёй. «Гэта эшафоты?» — «Якія эшафоты? Эшафоты стаялі на Лукішках… Магчыма, гэта рыштаванні для ўзвядзення помніка Кацярыне ІІ» — «А чаму іх два?» — «Тады не помнік… А! Згадаў! Менавіта ў гэтым годзе на катэдральнай плошчы па загадзе губернатара Мураўёва пачалося будаўніцтва фантану». Гэтак у гутарцы з мастацтвазнаўцам Сяргеем Харэўскім мы прыходзім да невялічкага адкрыцця. Не прамінаючы пры гэтым зазначыць: нездарма на форзацы чатырохкілаграмовага фотаальбому «Вільня: партрэт гораду» змешчаны здымак, датаваны менавіта 1863 годам.**

Аўтар гэтага здымка не вядомы. Затое добра вядомы аўтар самага першага візэрунка Вільні ў гісторыі фатаграфіі. Ім стаў Альберт Свяйкоўскі, які зняў віленскі краявід у 1854 годзе. З гэтага моманту, сцвярджае Харэўскі, пачалася гісторыя Вільні ў беларускай фатаграфіі.

Фотаальбом «Vilnius: miesto portretas» — не проста сувенір для турыстаў, якія сцякаюцца ў колішнюю «Крывіцкую Мекку» з усяго свету. Гэта новае асэнсаванне Вільні яе цяперашнімі жыхарамі і гаспадарамі, апошняе слова еўрапейскай урбаністыкі. Структура альбома даволі мудрагелістая: здымкі з сярэдзіны XIX стагоддзя да нашага часу змешчаныя не ў храналагічным, а ў тэматычным парадку, укладальнікі шукалі і паспяхова знаходзілі сугуччы ў працах фотамастакоў розных нацый і эпохаў.

«Літоўцы доўга і пакутліва засвойвалі Вільню — чужы ім культурна горад — пасля вайны, — кажа Харэўскі. — Усплёск уласна літоўскай віленскай фатаграфіі прыйшоўся на 1970-я. Пасля Вільня як бы перастала іх цікавіць, стала для іх халодным турыстычным аб'ектам… І вось цяпер гэты альбом, які даводзіць: літоўцы даспелі да мультыкультурнага асэнсавання сваёй цяперашняй сталіцы».

Фатаграфіі суправаджаюцца ўрыўкамі з сусветнай літаратуры, прысвечанымі Вільні: Чэслаў Мілаш ды Рамэн Гары, Альфрэд Дзёблін ды Томас Вэнцлава… На пачатку ідуць вершы, сімвалічна пададзеныя на мовах арыгіналу. Беларусь тут прадстаўляе Максім Багдановіч са знакамітым: «Вулкі Вільні ззяюць і гулка грымяць!..» «Так шыкоўна Багдановіча яшчэ ніколі не выдавалі!» — захапляецца Харэўскі.

Беларускі складнік не абмяжоўваецца тэкстамі: апроч класічных фатаграфій Юзафа Чаховіча (другая палова XIX стагоддзя) і Яна Булгака (1910-я) тут змешчаныя фотапрацы нашага сучасніка Дзяніса Раманюка). Тое, што душэўнай цеплынёй і святлом напоўненыя фатаграфіі менавіта беларускіх фотамастакоў, заканамерна: каб добра зняць горад, трэба адчуваць яго сваім.

Як прыклад Харэўскі прыводзіць прызнанне літоўскага акцёра Ёзаса Будрайціса: маўляў, той так і не спасціг Вільні, хоць пражыў там палову жыцця. Каб адчуваць горад, трэба прабавіць у ім маленства… Так было з фотамастачкай Аленай Адамчык, якая ў сталым жыцці вярнулася ў Вільню ўжо з мінскім досведам… Хоць яе працы 1990-х і не ўвайшлі ў дадзены альбом, яны высока ацэненыя ў Еўропе як нестандартны погляд на Вільню сваю — знутры. І пры гэтым беларуская Вільня непазбежна, на думку Харэўскага, у гэтай майстаркі рыфмуецца з Мінскам.



Vilnius: miesto portretas. Vilnius: R. Paknio leidykla, 2010

Паралелі «Вільня — Мінск у фатаграфіі» напрошваюцца самі сабою… «Ці магчымы такі альбом для Мінска?» — задае Харэўскі амаль рытарычнае пытанне. «Тэхнічна, канешне, магчымы, — тут жа адказвае ён, — існуе безліч выяваў Мінска не на нейкіх там «старых паштоўках», а на высокамастацкіх кадрах, і з кожным годам гісторыкі фатаграфіі адшукваюць усё новыя архіўныя здымкі. А колькі ў нас літаратурных згадак пра Мінск! Колькі эсэ, вершаў!.. Задайце сабе пытанне: каго ў прыстойнай Еўропе здольныя зацікавіць «шэдэўры альбомараблення» кшталту «Мінск вячэрні»? Гэта пазамінулае стагоддзе пазіцыянавання роднага горада».

Але, здаецца, такога альбому на афіцыйным узроўні яшчэ доўга не будзе. Здымкі XIX стагоддзя і сучасныя выявы Вільні адрозніваюцца хіба тэхнікай ды аўтарскім поглядам: вуліцы, а таксама назвы вуліц, цэрквы ды касцёлы застаюцца на сваім месцы. Мінск жа за гэты час змяніўся да непазнавальнасці.

Таму, відаць, усім рамантыкам беларушчыны па-ранейшаму застанецца духоўна блізкай яна — Вільня.



Фота Дзяніса Раманюка (2000 г.)

Дзяніс Раманюк ад 1992 года, калі ён пачаў навучанне ў Віленскай мастацкай акадэміі, і да сёння жыве тут, застаючыся самім сабой. Беларускім мастаком, шчыльна звязаным з культурным кантэкстам Мінску, дзе нарадзіўся і пачаў свой творчы шлях. Дзе значнае месца ў нацыянальнай культуры займаў ягоны бацька, Міхась Раманюк і дзе ён выкладаў мастацтва сам. Таму ягоная творчасць зварачаецца найперш да беларускага гледача, прапануючы яму віленскае люстэрка. Люстэрка, у якім ён бачыць уласны адбітак.

**Сяргей Харэўскі. З лекцыі «Вільня ў беларускім фотамастацтве на мяжы XX і XXI стагоддзяў»**



Фота Яна Булгака (1917 г.)

Ян Булгак (1876–1950) — фотамастак, краязнавец, этнограф. У 1910-я афіцыйна займаў пасаду віленскага гарадскога фатографа. Зрабіў вялікі ўнёсак у развіццё урбаністычнай і этнаграфічнай фатаграфіі.

## Фатаграфуе Ян Булгак

*На патэфоне*
*Гучыць вясёлы пасадобль.*
*Што там у садзе Бэрнардынскім?*
*Цырк шапіто? Мадам Фурэ?*
*Ах, вішні расьцьвілі?*
*О, Божа, колькі жабракоў*
*На плошчы перад катэдрай...*
*Якія бледныя ў іх твары.*
*Як рукі з голаду дрыжаць...*
*Мая Зямля,*
*Хоць крываточаць Твае раны,*
*Ты йшчэ багата Боскім Духам,*
*Бо моляцца ж, бо моляцца*
*За ўсіх.*

**1987 г. З кнігі: «Зянон. Глёрыя Патрыя» м. — Вільня, 2000**

СПАДЧЫНА

# ГІСТАРЫЧНАЕ РЭХА ГРУНВАЛЬДА

Аляксей ХАДЫКА

*Багародзіца, Дзявіца*
*Богам славёна, Марыя.*
*У твайго сына, Гаспадзіна*
*Маці звалёна, Марыя.*
*Маці звалёна, Марыя*
*Зычы нам і адпусці нам.*

**Па словах храніста Яна Длугаша, які назваў рэлігійны гімн «Багародзіца» «carmen patrium» — песняй Айчыны, гэтыя радкі спявалі войскі Вітаўта і Ягайлы, ідучы ў рашучую бойку Вялікай вайны (1409–1411) з Тэўтонскім ордэнам. Так, 15 ліпеня 1410 года «Багародзіца» гучала над полем Грунвальда. А канчаткова перайшла ў катэгорыю нацыянальных сімвалаў, калі яе тэкст быў у 1529 годзе ўключаны ў І Статут Вялікага княства Літоўскага.**


Бітва пад Грунвальдам, дрэварыт XVI ст. З Хронікі Марціна Бельскага

## Грунвальд і сучаснікі

Гэтак і Грунвальдская перамога, вайсковае сутыкненне эпічнага маштабу, у якім нашы продкі супольна з палякамі перамаглі больш за 30 тысяч рыцарскага інтэрнацыяналу з усёй Еўропы, даўно пачала набываць абрысы сімвалу. Гады з два таму падобны падыход справакаваў вядомага айчыннага гісторыка Генадзя Сагановіча на абструкцыю: значэнне Грунвальдскай перамогі, заявіў ён, пераацэненае, і чым хутчэй беларусы пазбавяцца ад чарговага міфа, тым лепей.

Гісторык слушна сцвярджаў: Тэўтонскі ордэн не меў планаў стварэння вялікай дзяржавы з уключэннем новых земляў Польшчы і ВКЛ. А з часоў Крэўскай уніі 1385 года паміж Польшчай і ВКЛ слабеў і схіляўся да саюзу з суседзямі, і таму рабіць паралелі з XX стагоддзем — пра выратаванне славянства ад нямецкай навалы, што і абумовіла папулярнасць Грунвальдскай перамогі сярод прыдворных савецкіх гісторыкаў — зусім не слушна. Акрамя таго, Польшча з ВКЛ мелі ў некалькі разоў большы дэмаграфічны патэнцыял, чым Ордэн, і значная перавага іх вайсковых аддзелаў у адкрытым сутыкненні 15 ліпеня 1410 года невыпадковая. Да таго ж пытанне этнічнасці на той час яшчэ нельга звязаць з войнамі: Вялікая вайна не была славяна-германскім супрацьстаяннем.

Тым не менш, чым далей, тым болей слава перамогі пад Грунвальдам сёння становіцца прадметам увагі гісторыкаў, незалежных грамадскіх аб’яднанняў, дзяржавы. Толькі грамадскі аргкамітэт па святкаванні 660-годдзя Вітаўта Вялікага і 600-годдзя Грунвальдскай (па-беларуску Дубровенскай) перамогі апошнімі днямі правёў некалькі святочных мерапрыемстваў.

6 ліпеня ў мінскай катэдры асвяцілі выкананыя мастачкай Аленай Лось рэканструкцыі сцягоў вайсковых харугваў ВКЛ з грунвальдскага поля — Віленскай, Менскай, Смаленскай, якія неслі на прапарах выявы Пагоні і Багародзіцы, і аддзелаў, асабіста ачольваных Вітаўтам, з яго родавым гербам «Калоны». Сцягі мусяць удзельнічаць у святкаванні 15–18 ліпеня 2010 года пад Грунвальдам у Польшчы. Плюс да таго адбылася прэсавая канферэнцыя гісторыкаў і адмысловая мастацкая выстава суполкі «Пагоня», адчыненая з 9 ліпеня ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча, — «Грунвальд за смугою часу». Да юбілею на прэзентацыі ў Нацыянальнай бібліятэцы прадставіў выпушчаную выдавецтвам «Беларусь» кнігу «Ваяры Грунвальдскай бітвы» доктар гістарычных навук Юры Бохан.

Не адсталі ў імпэце падкрэсліць гістарычную значнасць Грунвальда дзяржаўныя структуры. Рыцарскі фэст у Навагрудку ў апошнія выходныя чэрвеня прапагандаваўся як грунвальдскі. Праграма перадач БТ насычалася сюжэтамі і дакументальнымі перадачамі, прысвечанымі Вітаўту і знакамітай сярэднявечнай бітве. Часопіс «Маладосць» з пачатку года друкаваў пераклад гістарычнай хронікі паляка Яна Длугаша «Грунвальдская бітва», найбольш дэталёвага апісання падзеі, у якой бралі ўдзел бацька і дзядзька аўтара. Нават у крыпце праваслаўнага храма Усіх Святых у Мінску, дзе дзейсная ўлада стварае свайго роду мемарыял змагарам за Радзіму, побач з сумніўнымі з пункту гледжання беларускасці аб’ектамі знайшлося месца скрынцы зямлі з грунвальдскага поля.

## Грунвальд і прапаганда

Выкарыстанне Грунвальда ў якасці прапагандысцкага сімвалу, зрэшты, сягае ў даўніну двух стагоддзяў. На 500-я ўгодкі бітвы ў падзеленай Польшчы ў «апошнім вольным горадзе» Кракаве паўстаў велічны скульптурны грунвальдскі манумент, зруйнаваны немцамі ў гады другой сусветнай вайны і адноўлены пасля яе. Яшчэ раней мастак Ян Матэйка (1838–1893) у 1878 годзе стварыў непаўторную панараму бітвы памерам амаль 5 на 10 метраў, дзеля якой сёння ў Нацыянальным музеі ў Варшаве адведзена адмысловая сцяна ў зале, прысвечанай творчасці мастака. На чарговы грунвальдскі юбілей 10 год таму была зладжана адмысловая выстава толькі аднаго гэтага твора ў Вільні.

У сваю чаргу, немцы, на галаву разбіўшы 1-ю і 2-ю Расійскія арміі 23–30 жніўня 1914 года пад Аленштайнам у 30 кіламетрах ад Таненберга (Грунвальда), па прапанове Макса Хофмана далі сваёй вікторыі імя «бітвы пад Таненбергам», як бы змываючы ганьбу паразы 504-гадовай даўніны. Так першая сусветная вайна перакрыжавалася з падзеямі паўтысячагадовай даўніны. А Нацыянальная нямецкая партыя на выбарах 1920 года на сваім плакаце выяўляла нямецкага героя з крыжацкай адзнакай на грудзях — ахвяру ваяўнічага Паляка і хцівага Сацыяліста. Як адзначаў сучасны брытанскі гісторык Норман Дэвіс у сваёй манаграфіі «God’s Playground», савецкая гістарыяграфія, інтэрпрэтуючы ўдзел у грунвальдскай бітве смаленскіх палкоў як трыумф вайсковай сілы расійскіх аддзелаў, праводзіла самыя неверагодныя паралелі з Грунвальдам на тэму «нямецка-славянскага» супрацьстаяння. Грунвальд разглядаўся нават як прадвеснік перамогі ў Сталінградскай бітве.

Па вялікім рахунку, Грунвальдская бітва, безумоўна, мела поўнае права зрабіцца знакавай падзеяй для рэтра-ўшанавання гераізму пераможцаў. Прынамсі, у значна большай ступені, чым Кулікоўская бітва 1380 года, вынікі якой не дазволілі Маскве вызваліцца ад панавання Залатой Арды. Ці «Лядовае пабоішча» Аляксандра Неўскага — шараговая бойка наўгародцаў з войскамі Тэўтонскага ордэна ў 1242 годзе, колькасць удзельнікаў якой у дзесяткі разоў саступала Грунвальду.

## Што ведае кожны школьнік

Заснаваўшы напрыканцы XII стагоддзя ў нізоўях Віслы сваю вайскова-рэлігійную дзяржаву, цягам наступных двух стагоддзяў Тэўтонскі ордэн пашыраў сваю дзейнасць на поўдзень і ўсход, на Мазовію, Прусію і Жамойцію, дэкларуючы хрысціянізацыю гэтых апошніх язычніцкіх земляў Еўропы. Так знікла, анямечанае, балцкае племя прусаў. Напрыканцы XIV стагоддзя Польшча не мела выйсця да Балтыйскага мора.

У сваім змаганні за пасаг вялікага літоўскага князя са стрыечным братам, каралём Польшчы Ягайлам Вітаўт неаднойчы ўступаў у саюз з крыжакамі, ахвяруючы ім Жамойцію. Апошні раз гэта адбылося паводле Салінскай дамовы 1398 года, якая развязвала Вітаўту рукі ў канчатковым замацаванні пад уладай ВКЛ Смаленска. Калі б мы разважалі ў сучасных нацыянальных катэгорыях, то сітуацыя, калі супраць Ордэна ў 1409 годзе паўстала Жамойція, абмалёўваецца наступным чынам: стрыечныя браты польскі кароль Ягайла і беларускі князь Вітаўт пераадолелі даўнія спрэчкі для дасягнення супольных мэтаў. Першага цікавілі спакой паўночных тэрыторый Польшчы, другога — выратаванне сваякоў новаахрышчанай Летувы, якая ў адваротным выпадку рызыкавала знікнуць з мапы Еўропы.

Фармальна вайна была абвешчана вялікім магістрам Ордэна Ульрыхам фон Юнгінгенам 6 жніўня 1409 года Ягайлу. Праўда, праз месяц палякі часова — да дня Яна Хрысціцеля (24 чэрвеня, дня сонцастаяння, 1410 год) замірыліся з Ордэнам, у той час, як войскі ВКЛ працягвалі ратаваць Жамойцію. У снежні 1409 года Вітаўт запрасіў Ягайлу ў Берасце, каб распрацаваць план рашучай кампаніі 1410 года супраць Ордэна — паход на поўнач ад Мазовіі да сталіцы Ордэна Мальбарка.

Так яно і адбылося. Падлікі гісторыкаў колькасці аб’яднаных войскаў ВКЛ і Польшчы розняцца — ад 17 да 39 тысяч. Як і ордэнскіх сіл — ад 11 да 27 тысяч. Маючы меншасць прыкладна ў 1,5 разоў, крыжакі валодалі перавагай у лепшым узбраенні цяжкіх латнікаў, артылерыі (бамбарды), больш зручнай пазіцыі на ўзвышшы, абароненай прыхаванымі пасткамі-ямамі. Там загінулі першыя шэрагі конніцы ВКЛ, што зранку 15 ліпеня пайшлі ў атаку, сваімі целамі ладзячы шлях сябрам па зброі. Пад сцягамі крыжакаў стаяла 51 харугва, саюзнікі мелі 90, з іх — 40 войска ВКЛ.

Войскі ВКЛ — з Берасця, Ваўкавыска, Гародні, Ліды, Пінска, Полацка, Мсціслаў’я і шмат іншых беларускіх земляў, уключаючы «новапрыдбаныя» смаленскія тэрыторыі. Ваяры апошніх сталі насмерць, калі пасля першай атакі правае крыло войск Вітаўта, разам з татарскімі аддзеламі, што ўваходзілі ў склад сіл ВКЛ, імітавалі ўцёкі. Потым быў наступ палякаў з рызыкай страціць каралеўскі штандар, контрнаступ крыжацкага рэзерву, акружэнне апошняга, смерць вялікага магістра і канчатковае знішчэнне большасці ваяроў Ордэна. Паход на Мальбарк скончыўся яго беспаспяховай двухмесячнай аблогай і замірэннем у верасні 1410 года.

## Вынікі

Здавалася, Ордэн не быў знішчаны канчаткова, і, паводле Торуньскага міра 1411 года, саступіў Жамойцію ВКЛ толькі на працягу жыцця Вітаўта і Ягайлы. Але, як, высветлілася — назаўсёды. Прыемным дадаткам да таго была кантрыбуцыя, прызначаная за палонных — 100 тысяч срэбных пражскіх грошаў, каля 18 тон паўнавартаснай срэбнай манеты. І прызнанне вяршэнства польскага караля. Урэшце тэрыторыя Ордэна ў 1525 годзе пераўтварыўся ў васальнае герцагства Прусія. Прынамсі, як сцвярджаюць гісторыкі, больш ніколі агрэсія з боку нямецкіх рыцараў не пагражала землям Польшчы і ВКЛ. Толькі прускі герцаг Альбрэхт спрабаваў запрасіць Скарыну для пачатку кнігадрукавання ў Крулявец, але беларускі першадрукар збег ад выгаднай, але не прымальнай для яго прапановы.


Ягайла і войска. Рэканструкцыя на Грунвальдскім полі 2003 г.

Да таго ж, Польшча і ВКЛ, папярэдне аддзеленыя ад вялікай еўрапейскай палітыкі сілай Ордэна, зрабіліся яе аўтарытэтным суб’ектам. І менавіта Ягайлавічы з Габсбургамі на Венскім кангрэсе вырашалі дынастычныя лёсы кантынента. Безумоўна, гэтаму ўздыму спрыяў і свабодны рэжым гандлю праз балтыйскія парты, які прынесла ВКЛ і Польшчы грунвальдская перамога.

Ці трэба ўрачыста казаць пра тое, што пасля Грунвальда 500 год узброеныя нямецкія салдаты не з’яўляліся на беларускіх землях — гэта справа другасная. Як паказала гісторыя, галоўная небяспека мірнаму жыццю ВКЛ узнікала з супрацьлеглага боку.

▸ **ДАСЛЕДАВАННЕ**

# ЗУБР НА ГЕРБАВЫХ ГУЗІКАХ ГРОДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ

**Гродзенская губерня была ўтворана 21 студзеня 1801 года. У хуткім часе, 11 ліпеня 1802-га, быў зацверджаны і герб губерні. Ім, як гэта не дзіўна, аказаўся не алень святога Гумберта, а зусім іншая выява — зубр.**









Для нас гэта цікава таму, што значная колькасць сучаснай Брэсцкай вобласці тэрытарыяльна знаходзілася ў межах тагачаснай Гродзенскай губерні. За сваю 120-гадовую гісторыю герб быў некалькі разоў зменены. Так, 1 сакавіка 1831 года прыняты ўказ аб выявах на гербавых гузіках, дзе герб Гродзенскай губерні паказаны пад імператарскай каронай.

У такім выглядзе герб праіснаваў да 4 ліпеня 1857 года, калі быў прыняты закон «*О гербах губерний...*», згодна з якім над шчытом губернскага герба паказвалася імператарская карона, а вакол шчыта — дубовыя лісты з уплеценай андрэеўскай стужкай.

А 5 ліпеня 1878 года быў зацверджаны новы герб, складзены па правілах 1857-га: у чырвоным полі залаты зубр з чорнымі вачамі і языком. Шчыт атачаны залатымі дубовымі лістамі з уплеценай блакітнай андрэеўскай стужкай.

Але гэты артыкул — не зусім пра герб Гродзенскай губерні і самога горада Гродна. Гэтым я толькі адзначаю, што на гербе была выява зубра, а не якога-небудзь іншага звера. А гербавыя гузікі ў адзначаны час насіліся на мундзірах чыноўнікаў.

Як жа выяўлялі зубра мастакі-мадэльеры на тагачасных гузіках?

З апісаннем зубра як дзіўнай для еўрапейскага чытача жывёлы звярнуўся ў XVI стагоддзі Мікола Гусоўскі. Пэўна, ён адзін з першых, хто сутыкнуўся з праблемай, як паказаць нябачанага нікім звера.

*Скажам, калі б наўздагад я пачаў*
*падбіраць параўнанні*
*З мордай і каркам ягонымі, не*
*падабраў бы.*
*Злямчаны клін барады памялом*
*вытыркае з-пад сківіц,*
*З позірку зыраць і злосць, і нянавісць, і ярасць;*
*Грыва калматая шчыльна да*
*самых лапатак*
*Шыю ўкрывае, звісаючы ўніз па*
*калені.*
*Можа, магчыма тут наша падаць параўнанне —*
*Часта ж раўняюць малое з вялікім, як быка з індыкам, —*
*Гэта казёл барадаты з нагуляным целам.*
*Вось ён — бізон ваш. Што у нас*
*называецца зубрам!*
*Масці паджарай, як мешанка,*
*бурай і чорнай.*
*Быццам з вякоў у вякі праходзіў*
*праз горны*
*І гартаваўся, сабраўшы адценні*
*стагоддзяў.*
*Дзіўна, што ў кнігах апісаны ён*
*недакладна,*
*Я ж без падставы псаваць не хачу*
*і не буду*
*Тое, што ў спадчыну ён атрымаў*
*ад прыроды.*

Але адна справа — апісаць словамі, і зусім іншая — выява на метале, на такім масавым паўсядзённым атрыбуце чыноўніка, як мундзірны гузік. Здавалася б, мастак павінен быў вельмі сур'ёзна падысці да гербавай выявы. Але на справе атрымлівалася зусім іншае. Згадваюцца словы А. Пушкіна: «Там на неведомых дорожках следы невиданых зверей...»

І таму на гузіках тыражаваліся сапраўды невядомыя звяры, або вядомыя, але зусім не зубры, а такія экзатычныя, як афрыканская зебра.

Можна дапусціць, што ў заапарках Пецярбургу былі зебры, але не было зубра, ва ўсякім разе мастаку была вядома зебра і зусім не вядомы зубр. На самім гузіку цяжка зразумець, гэта зебра ці конь, але вось на паштоўцы 1856 года мастак выразна паказвае чорна-белыя смугі зебры. Не дзіўна, што такое бачанне зубра потым вылазіла і на гузікі. Між тым, у словах «зубр» — «зебра» бачна гукавое падабенства, магчыма, яно і падманула мастака, і ён пасяліў зебру ў Гродзенскай губерні. А што ж, калі Расійская імперыя такая аграмадная, дык чаму ў ёй не быць і зебрам?



Замест зубра знаходзім на гузіках і выяву лася, але не з характэрным для яго кароткім, а з доўгім хвастом, як у каровы, і рагамі аднагадовага самца. Знаходзяцца гузікі з вобразам адначасова ці то мядзведзя, ці то сабакі, ці то зубра. Ёсць і цалкам камічныя істоты: нешта накшталт п'янага лася.

Можна толькі ўявіць, колькі жартаў павінны былі выклікаць такія растыражаваныя «зубры» ў людзей, якія добра ведалі гэтых жывёл. А гузікі з іх выявамі даводзілася насіць высокапастаўленым асобам.

Але як можна правільна адлюстраваць зубра, калі пецярбургскія мастакі ў вочы не бачылі гэтага звера. Ды і зубр з дапамогай чалавека няўхільна набліжаўся да поўнага знішчэння.






**Даследаваў пчаляр-паэт**
**Мікола Папека**

▸ **ФЭСТ**

## УЛАДЫ ЧАРНІГАВА САРВАЛІ «BE FREE»

**Мэрыя горада Чарнігава, дзе планавалася правесці чацвёрты фэст «Be Free», не дала дазволу на яго правядзенне.**

Афіцыйная прычына адмовы пакуль не вядомая. Каля тыдня арганізатары спрабуюць атрымаць паперу з адказам на сваю заяўку. Вусна было паведамлена, што мерапрыемства не дазволена.

Фэст «Be Free» праводзіцца з 2007 года ў розных гарадах Украіны (Луцк, Львоў, Чарнігаў) пры падтрымцы і спрыянні мясцовых уладаў. Кожны фэст праходзіў на цудоўным арганізацыйным узроўні. Не стаў выключэннем і фэст мінулага года ў Чарнігаве. Ніякіх нараканняў па арганізацыі і самому мерапрыемству не прагучала. Была атрыманая нават папярэдняя згода на правядзенне фэсту і ў гэтым годзе. Аргкамітэт некалькі разоў наведваў горад, дзе вырашаліся ўжо практычныя моманты па арганізацыі мерапрыемства.

Таму адмова для арганізатараў была нечаканай. Варта адзначыць, што гэта не проста адмова, а фактычна зрыў мерапрыемства, бо за такі кароткі час, што застаецца да меркаванай даты «Be Free», немагчыма знайсці новае месца і якасна правесці фэст. Зараз арганізатары распачынаюць працу па правядзенню «Be Free» ў 2011 годзе.

«Сітуацыя гэтага года з фэстам у Чарнігаве мне нагадала сітуацыю ў Беларусі, — каментуе Віталь Супрановіч. — Чыноўнікі баяцца і перакідваюць адказнасць адзін на аднаго. Гэта можа быць звязана як са зменай кіраўніцтва на Украіне, так і з мясцовымі выбарамі, што адбудуцца вясной у Чарнігаве».

▸ **АБ'ЯВА**

**КАНЦЭРТ ЗМІЦЕРА ВАЙЦЮШКЕВІЧА**

20 ліпеня ў малой залі к/з Мінск адбудзецца традыцыйны летні канцэрт Зміцера Вайцюшкевіча з нагоды дня народзінаў артыста.

У праграме: лепшыя і новыя песні, выступ сяброў музыкантаў, песні і паэзія і, канешне ж, прыемныя неспадзяванкі!

Кошт квіткоў ад 25 000 да 35 000.

Даведкі: (029) 649 08 88. Каса: (017) 328 66 38

Кропкі продажу: каса к/з Мінск, пераход каля ГУМа (каля Макдональдса)

▸ **АБВЕСТКА**

Згублены дыплом № 0395378 (рэгістр. № 06/523) спец. «Правазнаўства», спецыялізацыя — «Прававое забеспячэнне бізнесу», выдадзены Анікеевай А.А., лічыць не сапраўдным.

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
**Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 663

Падпісана да друку 15.07.2010. 8.00.

Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.